№ 18 (520) 18 траўня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Танцы з ваўкамі

Палітыка Мілінкевіча перажыве палітыка Мілінкевіча, піша **Віталь Сіліцкі**. Старонка 3.

### «Да будзе ізьвержан ад сьвяшчэннага чыну»

Мітрапаліт Філарэт забараніў служэньне сьвятару Аляксандру Шрамку за ўдзел у кампаніі за перагляд закону «Пра свабоду сумленьня». **Старонка 7.**

### У дыпкорпусе склалася беларускамоўная суполка

Яе душа — гэта, безумоўна, Стэфан Эрыксан. Гутарка з кіраўніком аддзяленьня швэдзкага пасольства. **Старонка 16.**

## Сакрат, які быў «Кастусём»

Лідэр беларускай нацыянальнай меншасьці ў Польшчы **Сакрат Яновіч** прызнаўся, што быў сьвядомым інфарматарам польскага КГБ. Старонка 8.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Дзеля Яго

**16 траўня, на Дзень беларускай салідарнасьці, некалькі соцень юнакоў і дзяўчат маліліся пад сьценамі манастыра бэрнардынаў у сталіцы.**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

### Якая ў Вас адукацыя, чытач?

| | |
|---|---|
| Вышэйшая | 339 (60.2%) |
| Яшчэ вучуся ва ўнівэрсытэце / ВНУ | 142 (25.2%) |
| Сярэдняя | 29 (5.2%) |
| Яшчэ вучуся ў школе / вучэльні | 47 (8.3%) |
| Няпоўная сярэдняя | 6 (1.1%) |

Усяго прагаласавала: 563.



ДЗЯНІС РАМАНЮК

# Стань беларускім гісторыкам

Факультэт мастацтваў і гісторыі культуры Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ужо другі год робіць набор на аддзяленьне «Беларусістыка». На ім прадугледжаныя бакаляўрскія («Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія», «Ахова і выкарыстаньне культурнай спадчыны», «Візуальны дызайн і мэдыя», «Тэорыя і практыка сучаснага мастацтва») і магістарскія («Ахова і інтэрпрэтацыя культурнай спадчыны») праграмы для асобаў з вышэйшай адукацыяй і студэнтаў апошніх курсаў зь Беларусі.

Бакаляўрскія праграмы прадугледжваюць вочную і завочную формы навучаньня; магчымасьць вывучэньня літоўскай мовы і культуры; атрыманьне дыплёму дзяржаўнага ўзору Літоўскай Рэспублікі, якія прызнаецца ў краінах Эўрапейскага Саюзу.

Да прыкладу, па сканчэньні праграмы «Гісторыя Беларусі і культурная антрапалёгія» даецца дыплём «бакаляўр гісторыі» эўрапейскага ўзору і, вядома, грунтоўныя веды па беларускай, эўрапейскай і сусьветнай гісторыі, культурнай антрапалёгіі, этналёгіі, археалёгіі. Апроч таго, студэнт мае ўнікальную магчымасьць жыць і вывучаць гісторыю ў горадзе, вуліцы якога памятаюць вялікага князя Гедыміна, першадрукара Францішка Скарыну, паэта Адама Міцкевіча і паўстанца Кастуся Каліноўскага. У Вільні жывуць традыцыі шматнацыянальнага Вялікага княства Літоўскага, дзе пераважаў дух нацыянальнай і рэлігійнай талеранцыі. Курс прадугледжвае сустрэчы і кантакты зь вядомымі беларускімі гісторыкамі, пісьменьнікамі, паэтамі, журналістамі і палітыкамі.

Выпускнікі праграмы могуць працаваць навуковымі супрацоўнікамі музэяў, экскурсаводамі, выкладчыкамі гістарычных дысцыплінаў, выступаць у якасьці экспэртаў па праблемах гістарычнай спадчыны, весьці самастойныя дасьледаваньні ў галіне гістарычнай навукі альбо працягваць навучаньне ў магістратуры.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць у кіраўніка праграмы, доктара гістарычных навук Аляксандра Смаленчука (e-mail: smalian2001@tut.by).

## КАМЭНТАР РЭДАКЦЫІ.

# Дні, калі вырашаецца будучыня нацыі

Мы прывыклі ўжываць гэты выраз напярэдадні выбараў, рэфэрэндумаў ды іншых падобных падзеяў, вынік якіх у паняволенай краіне прадпісаны загадзя і нічога насамрэч не мяняе. Іншыя дні вырашаюць нямала. Напрыклад, тыя, калі бацькі запісваюць дзяцей у школы. Нацыя — гэта папросту штогадовы, штодзённы рэфэрэндум…

З 16 траўня адкрываецца набор у пачатковыя школы. Бацькі ў вялікіх гарадах маюць выбар: аддаць дзяцей на беларускамоўнае ці расейскамоўнае навучаньне.

У сталіцы прасьцей: тут беларускамоўныя гімназіі і школы ёсьць каля плошчы Якуба Коласа на Старажоўцы, у Кунцаўшчыне, Серабранцы, Малінаўцы і іншых раёнах. Многія беларускія бацькі і маткі падладжваюць сваё жыцьцё пад магчымасьць аддаць дзяцей між сваіх. Набываюць аўтамабілі, мяняюць графік жыцьця.

У рэгіянальных цэнтрах цяжэй. Калі няма дастатковага градусу самаарганізацыі, бацькі-беларусы застаюцца сам-насам.

Над беларускай мовай цяжэе кляймо беспэрспэктыўнасьці. Савецкая па сваёй ідэнтычнасьці пануючая група старанна падтрымлівае гэты стэрэатып. Аднак ёсьць усё ж усе падставы верыць, што беларуская мова паўторыць шлях каталянскай ці ўкраінскай, безь якіх ня трапіш у дзяржаўную адміністрацыю і сілавыя структуры ў тых краях.

Для практычных вынікаў трэба ясныя і практычныя крокі. Каб беларускі набор пайшоў у рост, досыць, каб за яго людзей агітавалі. Пры канцы 80-х беларуская школа ў гарадах адрадзілася, дзякуючы прапагандыстам з «Талакі», што пайшлі з кватэры да кватэры. Такая натура чалавечая: маўклівая большасьць выбірае тое, што рэклямуюць…

Досыць было б кароткага звароту прэзыдэнта: заклікаю аддаваць дзяцей у беларускамоўныя школы. Краіне патрэбны такі кіраўнік дзяржавы, які б штогод у траўні выступаў з такім пасланьнем, аж да тае пары, пакуль нацыянальная мова не акрыяе.

Але маўчаць улады, памоўквае і так званая «дзяржаўная беларускамоўная» прэса, «творчыя саюзы» і «дзяржаўныя асяродкі нацыянальнай культуры».

Беларусаў пазбавілі духоўнае свабоды, прапануючы ўзамен матэрыяльныя радасьці. Еж, пі, купляй ды-ві-ды, едзь на акіянскія пляжы. Любыя раскошы даступныя, акрамя нацыянальных. Любую кнігу можна свабодна купіць у Беларусі — акрамя тае, якая ўмацоўвае нацыянальныя пачуцьці. Любую музыку можна пачуць — акрамя тае, якая абуджае нацыянальныя пачуцьці. Атупляючы гармідар. А ў сытуацыях, як з выбарам школы, трэба засяродзіцца і падумаць пра рэчы парадку, вышэйшага за матэрыяльны.

Якой бы абмежаванай і кантраляванай ні была беларускасьць тых эрбэшных беларускіх школаў, усё ж яны застаюцца адной з зарукаў выжываньня нашага народу. Безь беларускай школы, бяз мовы нацыя разваліцца і асымілюецца на адным з гістарычных паваротаў.

Прымаючы рашэньне пра школу, мову навучаньня для дзяцей, падумайце пра Вашых прадзедаў і Вашых праўнукаў. Станьце зьвяном, якое счэпіць ланцуг мовы. Прыміце рашэньне.

# Танцы з ваўкамі

Палітыка Мілінкевіча перажыве палітыка Мілінкевіча, піша **Віталь Сіліцкі**. І на адрас Калінкінай і Марыніча: ніякія гульні з Расеяй не прынясуць Беларусі карысьці.

«Маніфэст» Сініцына і Парфяновіча ня быў бы тэмай, вартай абмеркаваньня, калі б не даволі дзіўная рэакцыя на яго публікацыю. Калі я ў першы раз прачытаў гэты дакумэнт, то адразу пракамэнтаваў на форуме nn.by, што цяпер у беларускай апазыцыі знойдзецца занятак на год наперад — мачыць Сініцына. На шчасьце, хоць у нечым выпала прыемна памыліцца што да апазыцыі. Выбрык дзьвюх асобаў лёгкіх палітычных паводзінаў праігнаравалі амаль усе (за выключэньнем, вядома ж, блогераў). Праведны гнеў толькі прыцягваў бы ўвагу, па трапным азначэньні блогера Фядуты, да «трызьненьня сівеючых палітычных мэрынаў». Сапраўды, маніфэст у падтрымку анэксіі быў напісаны так, што імкненьне ягоных аўтараў знайсьці спонсара літаральна праступала праз радкі, а тон быў такі, што рабілася відавочным: гэтыя асобы ў сваіх пошуках ужо гатовыя зьбіць цэны ўтрыманьня да «вакзальнага» ўзроўню. Любое абмеркаваньне ўздымала б аўтараў маніфэсту да ўзроўню гатэлю «Юбілейны».

### Зь вераю ў цуды

Аднак «маніфэст» нечакана выклікаў нэрвовую рэакцыю зь іншага боку — з той часткі беларускага грамадзтва, якая дагэтуль не пазбылася надзеяў, што збаўленьне Беларусі ад Лукашэнкі прыйдзе з Расеі.

Некаторыя, як Сяргей Скрабец на сайце nmnby.org, хуценька адхрысьціліся ад колішніх палітычных паплечнікаў. Маніфэст занадта складна клаўся ў адзін «крэатыўны шэраг» з акцыяй 2 красавіка, арганізаванай ім і Фраловым. Асацыяцыя паміж аўтарамі самага недарэчнага палітычнага дакумэнту і самай правальнай палітычнай акцыі ў гісторыі незалежнай Беларусі напрошвалася па азначэньні.

Іншыя, як Сьвятлана Калінкіна на сайце «Беларускі партызан», пайшлі ў контратаку і пачалі намякаць, што маніфэст — гэта хіба што правакацыя лукашэнкаўскіх спэцслужбаў. Яго мэта — схіліць эўрапейскіх палітыкаў да «дыялёгу» паміж лукашэнкаўскім рэжымам і Эўрасаюзам.

Растлумачыць такую нэрвовую рэакцыю лёгка. Сваёй махровай антыбеларускасьцю і відавочным глупствам «маніфэст» стварыў дрэнны інфармацыйны фон іншым, больш лагодным і завуаляваным палітычным праектам (ці, больш дакладна, праектам палітычных праектаў), што паходзяць амаль з таго ж асяродку і маюць тую ж ідэалёгію. Такую выснову можна зрабіць з таго, што мішэньню контратакі стала «тытульная» апазыцыя і ідэя дыялёгу з рэжымам Лукашэнкі, і яшчэ больш канкрэтна — Мілінкевіч і яго вядомы зварот да кіраўніка дзяржавы ад 8 лютага.

### Дыялёг за сьпінаю

Другая падстава для такой высновы — тое, што ў якасьці альтэрнатывы дыялёгу паміж ЭС і лукашыстамі чамусьці прасоўваецца таксама дыялёг, але... паміж ЭС і Расеяй. Ідэя пра тое, што ў Беларусі нешта зьменіцца толькі тады, калі яна стане «зонай пладатворнага супрацоўніцтва паміж Расеяй і ЭС», пачала даволі актыўна агучвацца. Узгадаем ліст, падпісаны Міхалам Марынічам і іншымі.

У мяне няма пярэчаньняў што да ідэі ліста — Беларусі сапраўды патрэбныя вялікія інвэстыцыі ў стварэньне інтэлектуальнага капіталу будучых рэформаў. Але ў мяне ёсьць пэўныя сумневы што да ідэалёгіі пасланьня.

У сканструяванай такім чынам дылеме (альбо «дрэнны» дыялёг паміж ЭС і Лукашэнкам, які вядзе да «ўсёдараваньня рэжыму», альбо «добры» дыялёг паміж ЭС і Расеяй, які мусіць прывесьці да станоўчых зьменаў) ёсьць толькі адзін пераменны фактар — альбо Лукашэнка, альбо Расея. Такім чынам, канструюецца простая ўмова — калі не Расея, тады Лукашэнка. Аднак гэтая формула — усяго толькі павернутая наадварот лукашэнкаўская страшылка, якую ён выкарыстоўваў падчас нафта-газавай вайны з Расеяй як на ўнутраным, так і на зьнешнім франтах!

Калі на ўласным палітычным полі поўнае зацішша, калі апазыцыйныя палітычныя гульцы не праяўляюць аніякай волі да рэальнага змаганьня за ўладу, калі яны ня ў стане генэраваць зьмястоўных палітычных праектаў, то пераарыентацыя ўвагі і надзеяў на зьнешніх гульцоў цалкам лягічная. Але гэтая лёгіка працэсу не зьняпраўджвае канцэптуальнай нелягічнасьці некаторых спадзяваньняў і памкненьняў. Альтэрнатыва дохламу, нерэальнаму праекту можа быць ня толькі дохлай і нерэальнай, але й небясьпечнай.

Агітаваць супраць дыялёгу з уладамі ў тым выглядзе, у якім ён прасоўваецца Рэнэ ван дэр Ліндэнам і Утай Цапф, мяне ня трэба. Такі «дыялёг» нагадвае хіба памкненьні аднаго з бакоў, які толькі што ўдзельнічаў ва ўсім вядомым фізыялягічным акце ў сужэнскім ложку, схіліць іншы бок да таго, каб пагутарыць, у той час, калі ён адварочваецца і ўжо храпіць. Дыялёг — гэта прывілей моцнага. Толькі тады ён будзе пачуты і толькі тады яго аргумэнты будуць мець сілу. Праблема прапанаванай стратэгіі Аб’яднаных дэмсілаў менавіта ў тым, што яны ў ёй выглядаюць менавіта як той самы ўдзельнік толькі што скончанага акту, які ў роспачы назірае за сыходзячым у сьпячку партнёрам.

**Працяг на старонцы 4.**

Частка апазыцыі ўсур’ёз разьлічвала, што за эканамічным ціскам на Лукашэнку з боку Расеі пойдуць палітычныя праекты, у якія можна было б упісацца. Атака на Мілінкевіча была выкліканая тым, што ягоныя пастава выключала ўдзел незалежнага грамадзтва ў гэтым.



Павал Шарамет (справа), Сьвятлана Калінкіна і Барыс Нямцоў.

Працяг са старонкі 3.

## Беспэрспэктыўны, але патрэбны

Тут, аднак, неабходна важная заўвага. Нягледзячы на тое, што дыялёг як каротка- і нават сярэднетэрміновая стратэгія беспэрспэктыўная, апазыцыя проста ня мае права адмаўляць такой магчымасьці ў прынцыпе, ня можа ня мець пляну і стратэгіі перамоваў на той выпадак, калі для яго высьпеюць умовы. Вопыт пераходу да дэмакратыі ў посткамуністычных краінах як падчас першай хвалі дэмакратызацыі ў рэгіёне (1989—1991 гады), так і падчас апошніх каляровых рэвалюцыяў паказвае, што без тактычнага альянсу з часткай прадстаўнікоў старога рэжыму апазыцыі ўзяць уладу ў свае рукі не ўдавалася амаль ніколі. Больш за тое, рэжымы, загнаныя ў кут, для якіх адсечаныя магчымасьці для мірнай трансфармацыі, могуць існаваць у замарожаным стане дзесяцігодзьдзі, і нават калі наступае момант іх крызісу, гэтыя працэсы суправаджаюцца такімі сацыяльнымі пер態трусамі, што сьвядома запраграмоўваць сваю краіну на такі шлях можа толькі той, хто яе вельмі моцна ня любіць. За «чаўшызацыю» ці «кастрызацыю» Беларусі мы дакладна заплацім ня толькі дзесяцігодзьдзямі аўтаркіі, але і жыцьцямі соцень юнакоў, якія ўрэшце кінуцца на шыхты службаў бясьпекі. Не спадзяючыся на магчымасьць перамоваў сёньня, апазыцыя ўсё ж мусіць акрэсьліць поле іх магчымасьці ў будучым.

## Калідоры выхаду

«Калідор выхаду» з гэтага стану ня мусіць быць завалены. Так, доступ да гэтага калідору мусіць быць старанна кантраляваны, але тая частка рэжыму, якая хоча ці захоча зьменаў, заўжды мусіць ведаць, што ў яе ёсьць іншы шлях, і, галоўнае, ведаць, што трэба рабіць, каб на гэты шлях стаць. Такім чынам, прапанова дыялёгу мусіць быць ня лямантам пакрыўджанага боку, а выклікам адказнай палітычнай сілы, гульнёй на апярэджаньне і на ўзмацненьне супярэчнасьцяў унутры сыстэмы пры магчымым яе аслабленьні. Такая прапанова, калі яна адмыслова агучана — гэта ня акт капітуляцыі перад уладай, а выклік ёй.

Кінуць такі выклік уладзе мог Аляксандар Мілінкевіч падчас зімовага нафта-газавага канфлікту з Расеяй. Прычыны і прырода гэтага канфлікту сталі прадметам дыскусіяў унутры незалежнага грамадзтва. Адны бачылі ў ім штуршок да аслабленьня і трансфармацыі лукашэнкаўскага рэжыму, іншыя — спробу Масквы прымусіць беларускія ўлады да здачы сувэрэнітэту. Праўда, насамрэч, была дзесьці пасярэдзіне. Відавочна, аднак, што палітычная пападлёка канфлікту была мінімальнай. Насуперак фантазіям беларускіх русафілаў, Пуцін ніяк не зьбіраўся «помсьціць Лукашэнку за трэці тэрмін». Зь іншага боку, можна ў чымсьці пагадзіцца з тымі, хто бачыў у гэтым канфлікце ня толькі яго непазьбежнасьць (датацыі рана ці позна мусілі скончыцца), але і пэўны станоўчы момант (непазьбежнасьць перагляду існуючай палітыка-эканамічнай мадэлі).

Сам рост цэнаў, безумоўна, ня нёс бы пагрозы незалежнасьці, калі б беларуская эліта была здольнай адказаць на новыя выклікі з пазыцыі нацыянальных інтарэсаў. Аднак, з аднаго боку, мы пабачылі як прафанацыю «абароны неза-

# Танцы з ваўкамі

лежнасьці» з боку ўлады, так і даволі дзіўную пазыцыю беларускай контрэліты. Яна часткова праігнаравала падзею, аддаўшы перавагу ўнутрыпалітычным разборкам. А часткова заняла пазыцыю заўзятара, смакуючы бойку і спадзеючыся, што хтосьці збоку нарэшце «ўрэжа» па ненавісным Лукашэнку. Апазыцыя ня здолела выступіць як *адказная* сіла, здольная адказаць на вызначальнае нацыянальнае пытаньне: якім чынам абараніць нацыянальныя інтарэсы і гарантаваць энэргетычную бясьпеку краіны. У гэтых умовах Лукашэнка натуральна атрымаў усе магчымасьці зацьвердзіць свой імідж бацькі і выратавальніка нацыі, чым ён бліскуча і скарыстаўся.

## Бяда і няўдача Мілінкевіча

Мілінкевіч быў адзіным, хто, прынамсі, паспрабаваў выйсьці за рамкі традыцыйнага стылю паводзінаў апазыцыі. Ягоны ліст да Лукашэнкі, што б ні пісалі крытыкі, ня быў ані прапановай калябарацыі, ані просьбай «падзяліцца ўладай» (гл. палеміку Пётры Рудкоўскага з Аляксандрам Адамянцам).

Мілінкевіч не адступіў ад прынцыповых пазыцый, зазначыў, што дыялёг улады з Захадам магчымы толькі пры зьмене палітычнай сыстэмы знутры краіны, і папярэдзіў, што менавіта гэтыя зьмены неабходныя дзеля захаваньня эканамічнай бясьпекі краіны. Ліст быў ня столькі пасланьнем Лукашэнку, колькі кіруючай эліце, якая ўсё больш схіляецца да незалежнасьці Беларусі, хай і па сваіх уласных прычынах. Мілінкевіч падаў сыгнал, што ён, а зь ім і тая частка незалежнага грамадзтва, якая на яго арыентуецца, устрымаецца ад такіх прыёмаў ва ўнутрыпалітычнай барацьбе, якія могуць паставіць незалежнасьць краіны (а разам зь ёй — інтарэсы пэўных элітных колаў) пад пагрозу.

Бяда і няўдача Мілінкевіча ў тым, што ён не зрабіў наступнага лягічнага кроку. Пасьля выразна выказанай Лукашэнкам адмовы ў дыялёгу для яго стваралася магчымасьць інтэрпрэтаваць гэтую адмову як доказ няшчырасьці афіцыйнай незалежніцкай рыторыкі і пазыцыянаваць сябе і дэмакратычныя сілы як адзінага сапраўднага абаронцу беларускіх інтарэсаў. На жаль, прыходзіцца канстатаваць, што гэта далёка не адзіны выпадак, калі былы лідэр дэмакратычных сілаў праявіў непасьлядоўнасьць, — чаму, уласна кажучы, і прыходзіцца гаварыць пра яго як пра лідэра ў прошлым часе.

## Тактыка ўстрыманьня

Аднак цкаваньне Мілінкевіча было распачатае не за яго згодніцтва з рэжымам (якога не было), а акурат за гэтую заяву аб самаўстрыманьні ад дзеяньняў, якія могуць пашкодзіць сувэрэнітэту Беларусі. Частка апазыцыі і незалежнага грамадзтва падчас зімовых падзеяў усур'ёз разылічвала, што за эканамічным ціскам на Лукашэнку з боку Расеі пойдуць пэўныя палітычныя праекты, у якія можна было б упісацца. Дапускаю, што тыя, хто спадзяваўся на такія праекты, шчыра вераць, нібы пе-

> Беларусь ужо бывала «зонай канструктыўнага супрацоўніцтва» паміж Эўропай і Расеяй: тры падзелы Рэчы Паспалітай, пакт Рыбэнтропа—Молатава...

рамагчы Лукашэнку можна толькі такім чынам. Адпаведна, атака на Мілінкевіча была выкліканая тым, што ягоная заява і пастава выключалі нават гіпатэтычны ўдзел незалежнага грамадзтва ў падобных праектах. Што зьвяло шанцы на іх ажыцьцяўленьне (ці нават распачынаньне) да нуля. Мітынг Скрабца і Фралова 2 красавіка таму сьведчаньне.

Маляваць Лукашэнку абаронцам беларускай незалежнасьці — гэта значыць ствараць дадатковую легітымнасьць рэжыму, але і ставіць пад пагрозу саму незалежнасьць. Маючы такія ілюзіі, грамадзтва рызыкуе праспаць здачу краіны. У адносінах да Лукашэнкі тут усё правільна. Аднак ці вынікае з таго, што Лукашэнка — гэта галоўная пагроза незалежнасьці, тое, што гэткай пагрозы з боку Расеі няма? Сардэчныя захворваньні — галоўная прычына сьмерці, але гэта ня значыць, што на хваробы пячонак можна «забіць». Калі Лукашэнка ўсё ж здасьць незалежнасьць, то здасьць ён яе не Вэнэсуэле і не Ірану.

## Што трэба Маскве

Лукашэнка ператварыўся ў галоўную пагрозу незалежнасьці акурат таму, што іншыя за апошнія дзесяць год удалося зьмінімізаваць. Такая пагроза цяпер не сыходзіць ані з боку беларускага грамадзтва (дзе памкненьні да аб'яднаньня значна паменшыліся), ані з боку ўладных элітаў (гэты сэгмэнт грамадзтва наагул найбольш настроены супраць інтэграцыі). Гэтаму паспрыяла таксама выхаваньне інстынкту самазахаваньня ў беларускіх контрэлітаў і як вынік — адсутнасьць «прарасейскай эліты» ў тым сэнсе, у якім гэта разумеюць у Маскве. Ствараць, нават з самых добрых памкненьняў, поле для рэалізацыі прарасейскіх палітычных праектаў — значыць ствараць легітымнае поле для фактычнай (калі не юрыдычнай) страты незалежнасьці, не атрымоўваючы ўзамен ніякіх шанцаў на станоўчыя палітычныя зьмены ўнутры Беларусі.

Мэты Крамля ў зімовым канфлікце былі відавочнымі. У сваім пасланьні да Фэдэральнага сходу прэзыдэнт Пуцін падкрэсьліў, што пытаньне аб'яднаньня зь Беларусьсю застаецца адкрытым («Расея гатовая пайсьці ў інтэграцыі настолькі далёка, наколькі гатовая Беларусь».)

Прынятая яшчэ ў 2000 годзе замежнапалітычная дактрына Расеі дакладна і недвухсэнсоўна вызначае, што мэта замежнай палітыкі Расеі — недапушчэньне заходніх структураў і інстытутаў на постсавецкую прастору. Простая размова зь любым сур'ёзным расейскім аналітыкам дакладна акрэсьліць прыярытэты расейскай палітыкі што да Беларусі — гэта як мінімум абмежаваньне яе сувэрэнітэту (блякаваньне магчымасьці яе палітычнай і эканамічнай інтэграцыі ў эўрапейскую супольнасьць) і захоп кантролю над крытычнай нафтагазавай і транзытнай інфраструктурай. Аб такіх рэчах, як дэмакратызацыя ці правы чалавека, гаворкі проста не ідзе. Цешыць сябе надзеяй, што прасоўваньне эканамічнага і палітычнага кантролю Расеі над Беларусьсю прывядзе да дэмакратызацыі і лібэралізацыі нашай краіны, да вызваленьня палітвязьняў ці асуджэньня забойцаў Ганчара — значыць уводзіць сябе і іншых у зман.

## І ў Расею, і ў Эўропу?

Пуцінская Расея сама па ўсіх паказчыках рэпрэсіўнасьці наблізілася да Бе-

Працяг на старонцы 6.




WWW.SVABODA.ORG

**Прарасейская акцыя Сяргея Скрабца і Валер'я Фралова сабрала 10 чалавек.**

**Працяг са старонкі 5.**

ларусі. Моцны аўтарытарны рэжым цудоўна можа суіснаваць з алігархічным капіталізмам, пабудаваным на ўзаемасувязі кантролю сілавікоў над уладай і ўласнасьцю. Ніякага іншага капіталізму сюды Расея экспартаваць ня можа — іншага ў яе самой няма.

Нягледзячы на зьнешнюю прывабнасьць ідэі «расейска-эўрапейскага праекту для Беларусі», на яе фотагенічнасьць для шараговага беларускага абываталя (большасьць якіх дагэтуль упэўненыя, што Беларусь можа інтэгравацца і ў Эўропу, і ў Расею адначасова), такая пастаноўка пытаньня выклікае сумныя паралелі. Некалькі разоў у сваёй гісторыі Беларусь ужо бывала «зонай канструктыўнага супрацоўніцтва» паміж Эўропай і Расеяй. Тры падзелы Рэчы Паспалітай, Берасьцейскі мір, дамова ў Рызе, пакт Рыбэнтропа-Молатава... Такое супрацоўніцтва заканчвалася, аднак, ня росквітам і вызваленьнем, а нацыянальнай катастрофай.

Дыялёг пра Беларусь безь Беларусі ня можа закончыцца нечым станоўчым і на гэты раз. Аб адзінай эўрапейскай пазыцыі ў адносінах да Беларусі (як і наагул аб адзінай замежнай палітыцы ЭС) гаварыць дагэтуль не даводзіцца. Таму парадак дня падобнага «дыялёгу» будзе дыктавацца Крамлём. Гутарка можа пайсьці толькі пра тое, каб схіліць ЭС да згоды на тыя палітычныя праекты, якія Расея захоча рэалізаваць у Беларусі. Ва ўмовах вуглевадароднай залежнасьці ЭС ад Расеі эўрапейцы наўрад ці маюць нейкія мэханізмы, каб схіліць Расею да зьмястоўнага дыялёгу, прапанаваць Расеі штосьці, каб тая ўзамен паспрыяла дэмакратызацыі лукашэнкаўскага рэжыму.

Да таго ж, на зьмястоўны дыялёг (а не перамовы з мэтай прымусіць ЭС

> Ствараць поле для прарасейскіх палітычных праектаў — значыць ствараць падставы для страты незалежнасьці.

выдаць Расеі карт-блянш на рэалізацыю сваіх палітычных і эканамічных праектаў у Беларусі) Расея ня пойдзе і з унутрыпалітычных прычынаў. Антызаходняя гістэрыя і ксэнафобія там ужо дасягнулі такіх вышыняў, якія беларусам толькі сьняцца. Масавая сьвядомасьць там настолькі «накачаная» антыўкраінскай, антыгрузінскай і антыэстонскай кампаніямі, што любы дыялёг, мэтай якога была б вонкавая дэмакратызацыя заходняга суседа, проста непазьбежна будзе інтэрпрэтаваны публікай як геапалітычная параза.

## Не нашкодзь

У сьвядомасьці расейскіх элітаў і грамадзтва тэрмін «дэмакратыя» набыў статус лаянкі і асацыюецца хіба што з прасоўваньнем антырасейскіх рэжымаў. За апошнія месяцы толькі ўзмацніўся эканамічны і сілавы шантаж краінаў былога СССР — узгадайце дэманстратыўны мараторый на дамову аб звычайных узбраеньнях і непрыхаваныя пагрозы дзяржаўнага перавароту ў Эстоніі праз выссаны з пальца канфлікт вакол помніка. Відавочна, што ў выпадку зьмены палітычнай сытуацыі ў Беларусі наша краіна мусіць быць гатовая сутыкнуцца з такім жа прэсінгам, інфармацыйнай атакай, палітычным і эканамічным шантажом з мэтай прымусіць краіну прытрымлівацца той палітычнай траекторыі, якую для яе абярэ Расея. Супрацьстаяць такому прэсінгу можа толькі скансалідаваная нацыянальная эліта, а не спажывец чужых палітычных праектаў.

Рэалістычнасьць расейска-эўрапейскага супрацоўніцтва ў справе Беларусі ня большая, чым рэалістычнасьць дыялёгу з Лукашэнкам, які прасоўваюць некаторыя эўрапейскія палітыкі. Аднак палітычныя наступствы гэтага праекту могуць быць нашмат горшымі — ня робячы нічога дзеля зьмены палітычнай сытуацыі ўнутры краіны, такое прасоўваньне легітымізуе сам прынцып, што лёс Беларусі можна вырашаць за сьпінай самой Беларусі. Нічога добрага ад такога чакаць не выпадае.

**P.S.** Сказаўшы гэта, я цалкам усьведамляю, што дыялёг з Расеяй патрэбны. Ён патрэбны для дасягненьня простай стратэгічнай мэты — вынаходжаньня формулы цывілізаванага суіснаваньня Беларусі і Расеі як дзьвюх незалежных дзяржаваў. Але яго мусіць весьці найперш беларуская грамадзянская супольнасьць, якая павінна сама прапанаваць парадак такога дыялёгу, вызначыць неабходны мінімум супольнай пазыцыі, якая акрэсьлівае нацыянальныя інтарэсы краіны, і ўмець актыўна і пасьлядоўна іх абараняць. Нам трэба дарасьці да такога дыялёгу — калі хочаце, мы мусім выпрацаваць інстынкт нацыянальнага самазахаваньня, які дазволіць спакойна супрацоўнічаць і кантактаваць з усходнімі суседзямі. Любое дэлегаваньне адказнасьці за лёс краіны — ці то Эўропе, ці Лукашэнку, ці Расеі — робіць фармаваньне такога кансэнсусу немагчымым. Тады сапраўды Лукашэнка зноў перастане быць галоўнай пагрозай незалежнасьці Беларусі — аднак ані свабоды, ані незалежнасьці ў Беларусі не дадасца.

# «Да будзе ізьвержан ад сьвяшчэннага чыну»

Праваслаўны суд забараніў служэньне сьвятару Аляксандру Шрамку за ўдзел у кампаніі за перагляд закону «Пра свабоду сумленьня», он-лайн канфэрэнцыю ў «Нашай Ніве» і вядзеньне лайвджорналу.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У чацьвер 10 траўня прайшло паседжаньне царкоўнага суду, які разглядаў справу клірыка Сьвята-Пакроўскай царквы Менску Аляксандра Шрамка. Паводле словаў а.Аляксандра, суд больш нагадваў сабой нейкі трыбунал, не было ніякіх судовых працэдураў, пытаньняў. Быў проста зачытаны вэрдыкт: забараніць у служэньні і адправіць за штат. Аднак рашэньне царкоўнага суду носіць не канчатковы, а толькі рэкамэндацыйны характар, апошняе слова застаецца за мітрапалітам Філарэтам.

Найперш сьвятару Шрамку ў віну закідаецца ўдзел у прэс-канфэрэнцыі ў пратэстанцкай царкве «Новае жыцьцё», якая адбылася сёлета 25 красавіка. На ёй сьвятар выказаў сваё нэгатыўнае меркаваньне адносна закону «Аб свабодзе сумленьня». У прыватнасьці, Шрамко заявіў, што найчасьцей закон абмяжоўвае цэрквы, якія актыўна разьвіваюцца, хочуць займацца місіянэрскай дзейнасьцю ды пашыраць свой уплыў у грамадстве.

Практычна адразу пасьля гэтай канфэрэнцыі айца Аляксандра запрасіў да сябе на прыём начальнік аддзелу па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў з апарату ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасьцяў Аляксандар Калінаў. Чыноўнік прызнаўся, што ўпершыню бачыць праваслаўнага сьвятара, які выступае супраць гэтага закону. Шрамко лічыць, што рашэньне склікаць царкоўны суд магло прымацца і праз гэты візыт да Калінава.

Шрамку закідалі, што ўдзел у такой канфэрэнцыі праваслаўнага бацюшкі павышае статус царквы «Новае жыцьцё», якую прызнаюць нават ня ўсе нэапратэстанты.

Яшчэ адным пунктам абвінавачваньня ў бок Аляксандра Шрамка стаў ягоны ўдзел у он-лайн канфэрэнцыі на сайце газэты «Наша Ніва». Так, царкоўны суд зачытаў урывак зь яе, дзе айцец кажа пра ўдзел мітрапаліта БПЦ у інаўгурацыі Лукашэнкі: «Пажаданьне мітрапаліта Філарэта — гэта, можна сказаць, звычайная справа, калі галава галоўнай канфэсіі выказвае пратакольную падтрымку існуючаму прэзыдэнту. Калі б да ўлады прыйшоў Зянон Пазьняк, у мітрапаліта Філарэта знайшліся б добрыя словы і для яго». На думку суду, гэтае выказваньне абражае ўладыку Філарэта.

У віну таксама ставіцца публіцыстычны артыкул «Крэдыт вычарпаны» на сайце «Царква», а таксама «анэкдоты», то бок прытчы, якія айцец рэгулярна зьмяшчае ў сваім блогу. Варта адзначыць, што яшчэ 15 верасьня 2006 году епархіяльная рада з удзелам мітрапаліта вынесла папярэджаньне айцу Шрамку, а таксама забараніла без дазволу япіскапа займацца публіцыстычнай дзейнасьцю і заклікала зачыніць уласны сайт. У выпадку непадпарадкаваньня было сказана, што Шрамко паўстане перад царкоўным судом. Так урэшце і сталася.

На царкоўным судзе было адзначана, што айцец Шрамко парушыў наступны канон Апостальскай царквы: прасьвітары без дазволу япіскапа нічога не зьдзяйсьняюць. З гэтага вынікае: «Прасьвітар у клятвапраступленьні аблічоны, да будзе ізьвержан ад сьвяшчэннага чыну».

15 траўня мітрапаліт Філарэт зацьвердзіў рэкамэндацыю царкоўнага суду: падпісаў загад «аб забароне ў свяшчэннаслужэньні клірыку Сьвята-Пакроўскага прыходу Менску, святару Аляксандру Шрамко» і залічыў яго за штат — «да раскаяньня», то бок пакуль не пакаецца.

Аляксандар Шрамко яшчэ ня ведае, чым займецца. Паводле адукацыі ён фізык, працаваў у школе, разносіў газэты, быў дворнікам. У іншыя праваслаўныя юрысдыкцыі ці ва ўніяцтва Шрамко пераходзіць не зьбіраецца, бо ня бачыць у гэтым сэнсу.

Сьвятар Аляксандар Шрамко мае сваю пазыцыю адносна царкоўнага, палітычнага, грамадзкага, культурнага жыцьця краіны, ён прыхільна ставіцца да беларушчыны. У сярэдзіне 1990-х ён быў першым менскім сьвятаром, які пачаў ладзіць набажэнствы на беларускай мове. Ягоныя правіны зводзяцца да актыўнай камунікацыі зь незалежным грамадзтвам. Як бачым, беларускі экзархат Расейскай праваслаўнай царквы ня можа гэтага прыняць.

# Сакрат Яновіч: «Хочацца

Лідэр беларускай нацыянальнай меншасьці ў Польшчы, вядомы літаратар **Сакрат Яновіч** прызнаўся, што быў сьвядомым супрацоўнікам Службы бясьпекі (польскае КГБ).

Яновіч у 1958—1970 гадах назіраў за асяродкам беларускага тыднёвіка «Ніва», а таксама Беларускага грамадзка-культурнага таварыства ў Польшчы.

Паводле словаў самога Яновіча, усё жыцьцё ён намагаўся рабіць усё магчымае, каб СБ ад яго «адчапілася». Галоўным заданьнем Яновіча мела быць «дапамога ўладам у захаваньні беларускага асьветніцкага руху ад уплываў варожых сілаў».

«Я наіўна верыў, што змагаюся за беларускую справу. У 1966 годзе я зразумеў, пра якую «дапамогу» ідзе гаворка», — распавядае літаратар.

Сакрат Яновіч сьцьвярджае, што ня браў грошай ад спэцслужбаў, «часам некалькі злотых на гарэлку».

«Я нікому не зрабіў ніякай шкоды, але дрэнна тое, што я паддаўся», — кажа Сакрат Яновіч.

Прызнаўся ў супрацоўніцтве ён у люстрацыйнай анкеце.

Зь пісьменьнікам гутарыць карэспандэнт «Нашай Нівы». Сакрат Яновіч адзначыў, што адмаўляецца ад усіх інтэрвію, але зрабіў выключэньне для «Нашай Нівы».

**«Наша Ніва»: Раскажыце, як адбываўся працэс вэрбоўкі.**

**Сакрат Яновіч:** Гэта быў ліпень 1958 году. Я тады працаваў у рэдакцыі газэты «Ніва». Да мяне прыйшлі двое маладых сымпатычных людзей. Яны размаўлялі пабеларуску. У самой Беларусі спэцслужбы ніколі не размаўлялі на роднай мове, а ў нас размаўлялі. Папрасілі пра сустрэчу, я згадзіўся. Здаецца, што мы сустракаліся недзе ў гатэлі.

**«НН»: Чаму Вы тады пагадзіліся на супрацоўніцтва?**

**СЯ:** Тыя энкавэдысты былі тонкімі псыхолягамі. Яны пачалі мяне пераконваць, што трэба абараняць беларускія арганізацыі, газэты, часопісы ад варожых элемэнтаў. Я падумаў, што сапраўды раней такога ў Польшчы ніколі не было, каб было столькі беларускіх школаў, арганізацыяў. Беларусы былі сапраўднай культурнай аўтаноміяй у Польшчы. Гэта была відавочная заслуга «народнай улады». І трэба было так рабіць, каб гэтыя дасягненьні ня зьнішчылі розныя амэрыканска-ангельскія імпэрыялісты, таму я згадзіўся.

**«НН»: Што ўваходзіла ў Вашы абавязкі?**

**СЯ:** Я абавязаўся сачыць за некаторымі людзьмі. Найперш гэта тычылася рэпатрыянтаў зь Беларусі і іншых краінаў. У маіх абавязках было тое, каб сярод іх не аказалася якіх-небудзь шкоднікаў. Былых паліцаяў. Я ўваходзіў да іх у давер, высьвятляў, чаго яны хочуць, пра што думаюць. Раз-пораз мне давалі грошы на гарэлку. За чаркай заўсёды лягчэй увайсьці ў кантакт з чалавекам. Больш ніякіх грошай я не атрымліваў.

**«НН»: Як часта Вы рабілі даклады?**

**СЯ:** Прыкладна раз на месяц, але гэта не былі даклады ў простым сэнсе гэтага слова. Гэта былі звычайныя сяброўскія размовы. Канечне, падчас гэтых гутарак яны нешта запісвалі. Я расказваў ім пра былога рэдактара «Нівы» Юр'я Валкавыцкага, пра пісьменьніка Алеся Баршчэўскага. Аднак маё сумленьне перад імі чыстае, бо я заўсёды гаварыў пра гэтых людзей толькі станоўчае. Зразумейце, што не я адзін сачыў за імі, было шмат інфарматараў, якія рабілі розныя даклады. Зь іх усіх і складвалася нейкая агульная карціна для спэцслужбаў.

**«НН»: Ці былі выпадкі, калі Вы сваёй дзейнасьцю нашкодзілі каму-небудзь?**

**СЯ:** Так. Быў адзін выпадак. Прыехаў беларус з ЗША, які хацеў узяць у жонкі мясцовую беларуску. Я высьветліў, што ён уцёк у Амэрыку разам зь немцамі. Яго нявесту да сябе выклікалі ў службу бясьпекі, дзе сказалі, што замуж можаш выходзіць, але будзеш нашым інфарматарам у ЗША. Дзяўчына тая спалохалася і замуж ісьці за хлопца адмовілася. Праўда, ён усё адно ажаніўся зь дзяўчынай зь Беластоку. Сястрой сакратара беластоцкага абкаму. Яны жывуць і цяпер, маюць дзяцей, унукаў, у іх шчасьлівы шлюб. Так што і ня ведаю, ці нашкодзіў я. Больш такіх выпадкаў не было.

**«НН»: Чаму ўрэшце Вы спынілі супрацоўніцтва?**

**СЯ:** У 1966 годзе ў Беласток прыязджала Ларыса Геніюш, яна зачытала стэнаграмы выступаў на апошнім пісьменьніцкім зьезьдзе Аляксея Карпюка і Васіля Быкава. Я так прасякнуўся іхнымі выступамі, што напісаў ім чыста ліст, які перадаў праз Ларысу Геніюш. У лісьце не было ніякай крамолы. Праз пэўны час ліст невядомым чынам трапіў у рукі беластоцкіх спэцслужбаў, якія былі вельмі незадаволеныя гэтым. Тады я ўпершыню задумаўся, ці насамрэч яны думаюць пра тое ж, што і я, ці за адны каштоўнасьці мы змагаемся. Я зразумеў, што быў наіўным 21-гадовым юнаком, які верыў, што працуе на карысьць беларускай справы, але я памыляўся.

**«НН»: Рашэньне адмовіцца ад кантактаў са спэцслужбамі далося лёгка?**

**Канстытуцыйны суд зьмякчыў закон пра люстрацыю**

Канстытуцыйны суд (КС) Польшчы позна вечарам у пятніцу прызнаў не адпаведнымі канстытуцыі многія палажэньні закону «Пра люстрацыю». Абмеркаваньне ішло ў КС цэлыя тры дні. Прынцыповае значэньне мае адмена артыкулу закону, што абавязвае ўсіх дырэктараў школаў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і журналістаў, якія нарадзіліся да 1972 г. уключна, раскрыць сувязі з «органамі». Усяго пад дзеяньне сакавіцкага закону «Пра люстрацыю» падпадалі 700 тыс. чалавек. Тым, хто адмовіўся пісаць заяву, пагражала адлучэньне ад прафэсіі на дзесяць год. Прызнана, што намеры ўраду апублікаваць сьпісы асобаў, у мінулым зьвязаных з спэцслужбамі, і пазбавіць дэпутацкіх паўнамоцтваў тых, хто не прайшоў люстрацыю, супярэчаць канстытуцыі. Папраўкі КС робяць увесь закон неабавязковым для выкананьня. Напярэдадні прэзыдэнт Лех Качыньскі заявіў, што ў выпадку прызнаньня закону супярэчным канстытуцыі, ён загадае вывесіць у інтэрнэце дасье ўсіх грамадзянаў, якія супрацоўнічалі зь дзяржбясьпекай. Прыняцьце больш жорсткай рэдакцыі закону аб люстрацыі — часткі кампаніі па «дэкамунізацыі» і «дэкадэбізацыі» Польшчы, што вядзецца братамі Качыньскімі.

**Паводле «КоммерсантЪ»**

# то плакаць, то сьмяяцца»



**Сакрат Яновіч**

**нарадзіўся ў 1936 годзе. Празаік, эсэіст, адзін з найвялікшых аўтарытэтаў беларускай меншасьці ў Польшчы. Жыве ў Крынках на Беласточчыне.**

**СЯ:** Я прымаў яго некалькі разоў. Але энкавэдысты не хацелі гэтага чуць. Я перастаў кантактаваць зь імі, але яны прыходзілі да мяне дадому, дзе зноў пераконвалі. Прычынай для канчатковага разрыву стаўся даклад у службу бясьпекі яшчэ аднаго іхняга інфарматара — пісьменьніка Аляксандра Амельяновіча. Ён напісаў, што Сакрат Яновіч фашыст, нацыяналіст, ледзьве не эсэсавец. Гэта было ўвосень 1970 году, тады і здарыўся канчатковы разрыў. Пасьля гэтага я страціў працу журналіста ў газэце «Ніва». Працаваў дворнікам, шмат кім яшчэ, каб проста зарабіць сабе на кавалак хлеба. Мне было заўжды цяжка, як тады, так і цяпер.

**«НН»: Чаму Вы прызналіся толькі цяпер?**

**СЯ:** Бо не лічыў і не лічу гэты факт вельмі значным. Аднак, як высьветлілася, многія так ня лічаць. Здаецца, што брахаць на Яновіча становіцца ўжо модным. Брэшуць якраз тыя, хто ціхенька сядзеў у тыя часы, тыя, хто нікуды не высоўваўся, нашы беларускія калгасьнікі. Мне шмат тэлефануюць мае сябры па «Салідарнасьці», звычайныя палякі, выказваюць падтрымку. Кажуць, каб я не зьвяртаў увагі на зласьліўцаў. Яны злуюцца, бо іх імя нічога ня значыць, а імя Сакрата Яновіча нешта ды гаворыць людзям. Зь беларусаў патэлефанаваў толькі Алег Латышонак, бо ён сапраўдны інтэлігент.

**«НН»: Што Вы адчуваеце цяпер, калі зрабілі гэтае прызнаньне?**

**СЯ:** Часам хочацца сьмяяцца з усяго, што адбываецца вакол маёй асобы, а часам — плакаць. Найперш я зьдзіўлены, бо не чакаў, што гэта так закране людзей. Паўжартам я кажу, што задаволены гэтай афёрай. Бо болей ня буду лічыцца для гэтых людзей нейкім маральным аўтарытэтам, чалавекам, якога клічуць на розныя імпрэзы, сэмінары, просяць выраШыць нейкія спрэчкі. Цяпер я засяроджуся выключна на літаратурнай дзейнасьці.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

**Ці стала прызнаньне Сакрата Яновіча нечаканасьцю?**

Гісторык, колішні супрацоўнік беластоцкага тыднёвіка «Ніва», прафэсар **Алег Латышонак**: «Трэба разумець, што гэта адбывалася ў час, калі ўсё беларускае толькі што стала дазволенае. Сакрату, тады маладому чалавеку, казалі, што ён мусіць усё гэта абараняць. І так маладога чалавека вельмі лёгка ўцягнуць у быццам бы высакародную ідэю, а пасьля вельмі цяжка з гэтага выйсьці. Мы ўжо столькі ведаем гісторыяў, як хтосьці спрабаваў выйсьці з гэтай залежнасьці, і самае важнае — калі чалавек здолеў знайсьці ў сабе маральную сілу, каб парваць з такой сытуацыяй, тады ён можа стацца аб'ектам перасьледу, і Сакрат быў дзясяткі гадоў перасьледаваны. Цяпер я больш разумею, чаму з такой заядласьцю яго перасьледавалі ў 70–я гады».

Пісьменьнік **Аляксандар Баршчэўскі**: «Усе гады Яновіч рабіў усё, каб прадставіцца перад чытачамі як сумленьне беларускай нацыі. Ён часта лаяў беларусаў, што яны пазбаўленыя нацыянальных пачуцьцяў, што нячыстыя маральна й духоўна. Аказалася, што ён сам такі. І ён хлусіць, калі кажа, што калі СБ зь ім сустракалася, то ён вельмі пазытыўна гаварыў пра мяне й Ваўкавыцкага. СБ не ангажавала б чалавека, які б пазытыўна выказваўся пра іншых. Як гэта так, што ў размове з СБ ён казаў, што я добры, а пасьля йшоў дадому і ў сваіх дзёньніках аплёўваў мяне «з ног да галавы». Хай Бог яго судзіць, я з гэтым чалавекам не хачу мець аніякіх кантактаў.

Гісторык **Яўген Мірановіч**, былы рэдактар «Нівы»: «Для мяне гэта не было сэнсацыяй. Тады быў час такі, што ў меншасных рэдакцыях фактычна ўсе адзін пра другога інфармавалі. Такі парадак быў ва ўсім савецкім лягеры, і ня толькі сярод меншасных арганізацыяў. Тым больш што ён паспрабаваў адысьці ад гэтага, за што быў звольнены з працы. Я лічу гэта драмай чалавека, які меў годнасьць, каб пакінуць гэта за сабою. Ён зразумеў, што зрабіў памылку».

Паэт **Генадзь Бураўкін**: «Трэба ведаць пэўныя рэчы: ці было гэта актыўнае супрацоўніцтва ці фармальнае. Наколькі я ведаю Сакрата Яновіча, ён заўсёды быў асобаю з прынцыпамі, цікавы й сур'ёзны чалавек. Ня ведаючы дэталяў ягонага супрацоўніцтва, я баюся ацэньваць гэты ўчынак, але, бясспрэчна, мне гэта вельмі непрыемна».

**Паводле радыё «Свабода», Польскае радыё для замежжа**



WWW.SVABODA.ORG

**У Кракаве прайшоў энэргетычны саміт краінаў Усходняй і Цэнтральнай Эўропы. Прэзыдэнты шукалі альтэрнатыву расейскім энэрганосьбітам.**

## Слуцкае «цукровае» паўстаньне

Дзяржава імкнецца павялічыць сваю долю ў статутных фондах цукровых заводаў у Жабінцы, Гарадзеі, Скідзелі і Слуцку. Чыноўнікі даводзяць: за тры апошнія гады на прадпрыемствах былі рэалізаваныя буйныя інвэстыцыйныя праекты. Надышоў час разьлічвацца за помач акцыямі.

Слуцкія акцыянэры адзіныя не прынялі прапановы ўраду здаць акцыі па цане 1996 г. Па выніках галасаваньня на сходзе акцыянэраў дзяржаўная доля пакінутая на ранейшым узроўні — 27%.

**Паводле bulletinonline.by**

## Пісьменьнікі і палітыкі заклікаюць прыйсьці на суд да маладафронтаўцаў

Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, а таксама лідэры ўсіх палітычных партыяў зьвярнуліся да грамадзкасьці з заклікам 30 траўня а 14 гадзіне прыйсьці ў Савецкі суд на Лагойскі тракт, 3 і падтрымаць маладафронтаўцаў. «Ня маючы ў чым абвінаваціць удзельнікаў негвалтоўнага супраціву, КДБ увёў у крымінальны кодэкс антыканстытуцыйны артыкул 193 — «удзел у дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі», — пішуць яны ў звароце. Яны заклікаюць спыніць палітычныя рэпрэсіі ў краіне.

**МБ**

## Маленькая перамога ТБМ

Канстытуцыйны суд прапанаваў кіраўніцтву менскага гандлёвага цэнтру «Карона» (філіі ТАА «Тытуньінвэст») выкарыстоўваць беларускую мову разам з расейскай у афармленьні прадпрыемства і інфармаваньні грамадзян. Пра гэта гаворыцца ў адказе намесьніка старшыні Канстытуцыйнага суду Аляксандра Марыскіна на зварот старшыні «Таварыства беларускай мовы» Алега Трусава.

«Супрацоўнікі цэнтру павінны валодаць беларускай мовай у аб’ёме, неабходным для выкананьня службовых абавязкаў», — гаворыцца ў адказе. Канстытуцыйны суд накіраваў адпаведны ліст і кіраўніцтву «Кароны».

У суд ТБМ зьвярнулася, атрымаўшы ад кіраўніка гандлёвага цэнтру «Карона» Валер’я Палынкова адказ, што прадпрыемства выбрала расейскую мову для афармленьня гандлёвага цэнтру і інфармаваньня «з мэтай стварэньня спажыўцам максымальна зручнага ажыцьцяўленьня пакупак».

## Беларусь пераходзіць на вугаль

«Трэба вяртацца да вугальнай энэргетыкі», — мяркуе першы віцэ-прэм’ер Уладзімер Сямашка. На прэс-канфэрэнцыі 15 траўня ён адзначыў, што да 2012 г. будуць збудаваныя вугальныя электрастанцыі ў Зэльве і Берасьці.

Канцэпцыя энэргабясьпекі абавязвае думаць пра дывэрсыфікацыю энэрганосьбітаў.

**АК**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У.Сямашка і міністар эканомікі багатай на вугаль Украіны Анатоль Кінах.**

## Штандар наш бел-чырвона-белы пакрыў сабою горад Менск

14 траўня велізарны бел-чырвона-белы сьцяг зьявіўся на слупе ў раёне станцыі мэтро «Пушкінская». «Невядомыя» таксама вывесілі вялікія бел-чырвона-белыя сьцягі на доме блізу плошчы Калініна, Акадэміі мастацтваў, ля Траецкага прадмесьця, на Камароўцы, у Лошыцы ды іншых месцах.

Нагадаем, што 12 гадоў таму па выніках Ганебнага рэфэрэндуму гістарычная сымболіка была скасаваная і вернутая савецкая сымболіка.

А ў Баранавічах актывіст незарэгістраванага «Маладога фронту» замяніў дзяржаўны сьцяг на будынку адміністрацыі на бел-чырвона-белы. Аказалася, што за сьцягам сачыла відэакамэра, і Яраслава Грышчэню па запісе вылічылі. Яго пацягнулі ў пастарунак, але адпусьцілі пасьля складаньня пратаколу за дробнае хуліганства.

**СП**

### Шукаюцца супрацоўнікі бяз гучнага «дзе» і густога «чаго»

У валожынскай раённай газэце «Працоўная слава» прыцягнула ўвагу абвестка. «Стабільная кампанія» шукае прадавачак у салён па продажы мабільных тэлефонаў. Сярод патрабаваньняў — «чыстая расейская мова, з прыгожым вымаўленьнем, без беларускіх гукаў і словаў». Вось так…

**Паводле mfront.net**

## ЦЫТАТА

### Мэр Бабруйску: Мы не дэмакраты, каб абмяркоўваць



З надыходам вясны ў Бабруйску забуяў несанкцыянаваны гандаль. Старшыня гарвыканкаму Дзьмітры Бонахаў запатрабаваў, каб міліцыя складала на бабак пратаколы, і ў суд. Начальнік міліцыі запярэчыў, што няма ў яго такога права. Старшыня: «Мы не дэмакраты, каб абмяркоўваць, што правільна, што не… Несанкцыянаваны гандаль — гэта няправільна. Яго не павінна быць. Я патрабую, каб парадак быў наведзены».

**Паводле: «Вечерний Бобруйск»**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Вернікі працягваюць маліцца за вяртаньне касьцёлу Сьв. Язэпа.**

## Вірус «Нешта» паралізаваў «Тэхнабанк»

На тым тыдні камputарны вірус Neshta спаралізаваў працу камэрцыйнага «Тэхнабанку». Праграмны код вірусу нібыта склалі студэнты БДУ ў 2005 г.

Вірус напісаны састарэлай мовай праграмаваньня Delphi, а ў яго целе маецца аўтарскае пасланьне: «Neshta 1.0. Made in Belarus. Прывітаньне ўсім цікавым беларускім дзяўчатам. Аляксандар Рыгоравіч, вам таксама. Восень — кепская пара... Аліварыя — найлепшае піва! Best regards 2 Tommy Salo. Yours Dziadulja Apanas».

**МБ, «Ежедневник»**

## «Идеологи» душаць

Забаранілі канцэрт у Мазыры з удзелам гуртоў «Partyzone» і «Indiga». У Менску чарговы раз адмовілі «Краме». У мінулы панядзелак чыноўнікі забаранілі канцэрт ZET і IQ48. Выступ зладзілі ў іншым месцы, але на яго арганізатараў склалі пратакол. «Як за Саветамі, але цынічней, — кажа Лявон Вольскі. — Выйсьце ў правядзеньні кватэрнікаў».

**МБ**

## КАЛЯНДАР



## 125 гадоў Галубку

15 траўня — 125 гадоў з дня нараджэньня Ўладзіслава Галубка, драматурга, тэатральнага рэжысэра, актора, мастака, першага Народнага артыста БССР. Ён нарадзіўся ў 1882 г. на станцыі Лясная (Баранавіцкі раён). Працаваў грузчыкам, прыказчыкам у краме, сьлесарам у дэпо. «У 1896 г. за грошы, зробленыя на выгрузцы дроў, я набыў білет на галёрку менскага тэатру. Там і ўзьнікла ў мяне думка стаць артыстам...».

У 1920 г. стварыў вандроўны тэатар, зь якім аб'езьдзіў усю Беларусь. Пры канцы 1920-х Галубка зьвінавацілі ў нацыяналістычным ухіле. У 1937 г. ён зьнік у савецкай турме...

## IN MEMORIAM



## Памёр Алекс Сільвановіч

У ЗША, у горадзе Саўт-Рывэр, 14 траўня на 71-м годзе жыцьця пасьля цяжкай хваробы памёр Аляксандар (Алекс) Сільвановіч, шматгадовы працаўнік на беларускай грамадзкай, рэлігійнай, культурнай ніве.

Пераехаўшы з бацькамі ў Амэрыку на пачатку 1950-х, Сільвановіч здабыў вышэйшую адукацыю, працаваў у Тэхналягічнай групе ў штаце Нью-Джэрзі на адказных становішчах.

Быў шмат гадоў сябрам прэзыдыюму Рады БНР, належаў да Рады і Кансысторыі Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, да Беларускага інстытуту навукі й мастацтва. Браў удзел у арганізаваньні гуманітарнай дапамогі ахвярам Чарнобылю. Быў сустаршынём Кааліцыі ў абарону дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Лабіяваў у Вашынгтоне справу дапамогі Беларусі ў змаганьні за незалежнасьць і дэмакратыю. Быў сябрам рэдкалегіі «Ангельска-беларускага слоўніка».

Сьветлай памяці Алекс Сільвановіч пакінуў у глыбокім смутку жонку Ніну, двое жанатых сыноў, дзьве замужнія дочкі і ўнукаў. Пахаваны будзе на беларускіх могілках у Іст-Брансьвіку, недалёка ад месца, дзе жыў.

Вечная памяць вернаму сыну Беларусі, якую ён любіў і дзеля якой працаваў.

**Янка Запруднік, Самэрсэт (ЗША)**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Глябальнае Сітна

Калі разабрацца, сіценцаў мала што зьвязвае з самім Сітнам. Ядуць амаль усе з крамы (а з гледзішча фізіялёгіі, мы ўвогуле ёсьць тым, што ямо) — ад пскоўскага хлеба й колькі ў таматным соўсе з Курыльскіх выспаў да польскіх прыправаў ды эквадорскіх бананаў. Вольны час сіценцы аддаюць, у лепшым выпадку, сузіраньню мэксыканскіх сэрыялаў ды францускіх камэдыяў (тыя, хто мае сатэлітную талерку, увогуле пераключаюцца з краіны на краіну), або, у горшым, спажываньню зробленага на бяскрайніх прасторах Расеі шклоачышчальніка. Размаўляюць пра маскоўскіх «зорак» з чорнае скрынкі — на рынгу, у цырку, на лёдзе — або пра беспарадкі ў Эстоніі… таму й выходзяць на сіценскую вуліцу, быццам у адкрыты космас: толькі перабрацца на працу, у сельпо ці на пошту ды хутчэй прамінуць гэную шэрую аднастайнасьць.

Мала таго, большасьць вяскоўцаў кватаруе ў дамох, якія ім не належаць: леспрамгасаўскіх хатах, у старэнькіх бацькоў ці ў інтэрнатах. Таму ані закінутыя гароды, ані сьметніцы пасярод вёскі тут нікога не зьдзіўляюць — маўляў, гэта ня мае да мяне аніякага дачыненьня. Калгасная нічыйнасьць — справа вядомая, а ў Сітне яна падкрэсьленая яшчэ й ніякавасьцю мясцовай улады, ды й тым, што *адвыклі жыць зь зямлі*.

І ўсё-такі незьнішчальная беларускасьць скрозь саўковае запусьценьне праточваецца. Ля зарослае пырнікам хаціны раптам, бы фаервэрк, успыхне высаджаны гладыёлус; сям-там па вёсцы шамаціць цэляфан цяпліцаў пад памідоры; ды нават у самой канторы, на сэйфе, у плястыкавай конаўцы з-пад маянэзу распускаецца выкапаны ў лесе дрымотнік. Чуеш, як майстрыца з прыёмшчыцай зь веданьнем справы абмяркоўваюць, якім чынам прышчапляць дзічку, — і разумееш: насамрэч, людзі тут таго ж роду, што і ў Мосары, дзе пад кіраўніцтвам ксяндза Юзафа павыкараняли п'янства дыператварылі мястэчка ў квітнеючы раёк.

Але ж тае беларускае сілы хапае адно на куточак. На адчайна ўзьняты сьцяг. Астатняе… а-а, не маё. І калі ў тым жа

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

### 9 траўня

**Затрыманьні на Дзень Перамогі**

9 траўня падчас сьвяткаваньня Дня Перамогі ў Менску былі затрыманыя актывісты моладзевых дэмакратычных арганізацыяў. Сябры ініцыятывы **«Новы шлях»** віншавалі вэтэранаў у парку Горкага. Яны раздавалі ім паштоўкі з улёткамі, у якіх заклікалі падтрымаць моладзь, што адстойвае дэмакратычныя каштоўнасьці. Супрацоўнікі міліцыі Ленінскага раёну падышлі да маладзёнаў, калі ў тых ужо не засталося ніводнай улёткі, і перапісалі ў юнакоў пашпартныя дадзеныя.

У цэнтры Менску пасьля сьвяточнага салюту былі затрыманыя 19-гадовы **Ільля Шарбінскі** й 17-гадовы **Раман Багдановіч**. Міліцыянтаў найхутчэй зацікавілі значкі «За свабоду!», што насілі хлопцы. Затрыманых даставілі ў РУУС Цэнтральнага раёну.

**У Магілёве пратэставалі супраць адмены льготаў**

У Магілёве каля 100 студэнтаў пратэставалі супраць адмены льготаў. За акцыяй, якая доўжылася дзьве гадзіны, назіралі міліцыянты ды выкладчыкі магілёўскіх ВНУ.

Моладзь правяла пікет ды арганізавала збор подпісаў за захаваньне ільготаў. Студэнты працягнуць зьбіраць подпісы непасрэдна ў ВНУ, а потым перададуць іх ва Ўпраўленьне адукацыі Магілёўскага гарвыканкаму. Адзін зь лідэраў магілёўскай суполкі моладзі БНФ **Аляксандар Анісімаў** паведаміў, што на групу моладзі, якая ішла на акцыю, напалі невядомыя ў цывільным і моцна пабілі.

### 10 траўня

**Супраць Яраслава Грышчэні зноў узбудзілі крымінальную справу**

Адпаведную пастанову актывісту незарэгістраванага «Маладога фронту» ўручыла сьледчая Баранавіцкага ГУУС **Юлія Аскальдовіч**. У ім гаворыцца, што Я.Грышчэня пасьля заявы ў Баранавіцкім ГУУС, зробленай ім 20 красавіка 2007 г. аб добраахвотным спыненьні ўдзелу ў дзейнасьці «МФ», «фактычна працягнуў удзел у дзейнасьці гэтага незарэгістраванага грамадзкага аб'яднаньня пры правядзеньні шэсьця «Чарнобыльскі шлях» 26 красавіка 2007 г., пра што сьведчаць адзьнятыя матэрыялы». На падставе гэтага пракурор Баранавіч **Аляксандар Смаль** пастанавіў узбудзіць крымінальную справу паводле арт. 193-1 КК (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі).

**Маладым сацыял-дэмакратам адмовілі ў рэгістрацыі**

Моладзеваму грамадзкаму аб'яднаньню **«Маладыя сацыял-дэмакраты — Маладая Грамада»** адмоўлена ў дзяржрэгістрацыі. Адмова Мін'юсту матываваная тым, што статут наваўтворанага аб'яднаньня не адпавядае патрабаваньням ч.3 арт.9 закону «Аб грамадзкіх аб'яднаньнях».

**«Падавіцеся вашымі льготамі!»**

Пад Міністэрствам адукацыі ў Менску прайшла акцыя супраць адмены льготаў студэнтам **(на фота справа)**. Каля трох дзясяткаў актывістаў руху **«За свабоду!»** скінулі кашулі і пракрычалі «Падавіцеся вашымі льготамі!» Пасьля актывісты апранулі байкі з надпісам «За свабоду!» ды зьніклі. За акцыяй назіраў ахоўнік будынку, які адабраў у маладых людзей мэгафон і прыгразіў выклікаць міліцыю.

**Карная псыхіятрыя**

Магілёўскай актывістцы апазіцыі **Крысьціне Шацікавай** адмоўлена ва ўзбуджэньні крымінальнай справы па факце яе затрыманьня і шпіталізацыі. Падстава для адмовы – пракуратура Ленінскага раёну Магілёва правяла праверку і высьветліла, што службовыя асобы Магілёўскага абласнога псыхіятрычнага шпіталя, а таксама супрацоўнікі ППС УУС Магілёўскага аблвыканкаму, якія праводзілі затрыманьне і даставілялі К.Шацікаву ў шпіталь, дзейнічалі ў межах правоў, якія надаюцца законам «Аб міліцыі» і законам «Аб псыхіятрычнай дапамозе і гарантыі правоў грамадзян пры яе аказаньні». Шацікаву затрымалі на падставе калектыўнай заявы, напісанай нібыта жыхарамі яе дому.

**Крымінальная справа супраць Шылы**

Упраўленьне КДБ па Менскай вобласьці

Працяг на старонцы 14.

Мосары (таксама ж куточак у цэлым Паазер'і) парафіяне ўважаюць за свой абавязак упрыгожваць зямлю, на якой жывуць, хаця й лепш за іншых разумеюць, што *тут мы толькі госьці*, — у сіценца псыхалёгія «дом — тайга, мядзьведзь — гаспадар» апраўдваецца безнадзейнасьцю. Памру — хоць трава ні расьці. Або: сельсавет захоча — адбярэ. Або: выганяць з працы ў прамгасе — усё адно прападзе.

Вось і жывуць сіценцы штодня то на Курыльскіх выспах, то ў Галівудзе, то ў Вэнэсуэле.

Глябалізацыя?

Але ж пры ўсіх вартасьцях міжнароднага падзелу працы, транснацыянальнага капіталізму, вольнага гандлю ды ўсяленскай мэдыяпрасторы кропка апірышча (крытычна неабходная для вядомага рычага, пакліканага перавярнуць сьвет) — свая зямля. Дом. Сям'я.

Сіценцам, у якіх сьвядомасьць гаспадара вынішчалася і прыгонам, і савецкай калектывізацыяй, і камуністычным бязбожжам, востра патрэбная дапамога дзяржавы, каб адчуць *зямлю пад нагамі*. Неабходнае тэрміновае ўвядзеньне прыватнай уласнасьці на зямлю з правам продажу й перадачы ў спадчыну.

Сапраўдная рынкавая гаспадарка пачынаецца менавіта з гэтага.

І ня думайце, што лясная вёсачка на расейскім ўзьмежжы — вынятак. Глябальнае Сітна распаўзаецца па Беларусі значна хутчэй, чым будуюцца нейкія там аграгарадкі.

Мы ўжо каторы год б'емся над пытаньнем: як так зрабіць, каб несьвядомыя беларусы нарэшце палюбілі сваю краіну?

Усё проста.

«Мой родны кут, як ты мне мілы!..»

Трэба нарэшце даць кожнаму беларусу па сваім кавалку Беларусі. Каб той даводзіў да ладу згодна з асабістым уяўленьнем пра карыснасьць і прыгажосьць ды Боскім пакліканьнем. Праз два-тры гады пасьля ўвядзеньня прыватнай уласнасьці на зямлю вы й не пазнаеце Беларусі! Любоў да Радзімы сасьпявае праз асабістую, прыватную. Пасьля краху савецкіх спробаў навязаць «любоў да чалавецтва і плянэты *ваабшчэ*» шляхам абагульненьня чужога час заняцца *сваім* ды палюбіць *бліжняга*.

Беларусь трэба аддаць тым, хто ў ёй жыве. Толькі тады мы атрымаем цьвёрды грунт і для адкрытасьці сьвету, і для нацыянальнага абуджэньня.

*в.Малое Сітна*

Беларусь трэба аддаць тым, хто ў ёй жыве.

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Працяг са старонкі 12.

ўзбудзіла новую крымінальную справу супраць салігорскага актывіста «Маладога фронту» 17-гадовага **Івана Шылы**. Сьледчы **Вітольд Аляксееў** паведаміў Івану, што справа ўзбуджаная паводле арт. 193 КК РБ за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, і Шыла мае статус падазраванага.

### 11 траўня

#### Кацярыну Садоўскую пакінулі ў турме

Пра гэта яна паведаміла ў лісьце дахаты з Гомельскай жаночай калёніі. Камісія ў калёніі двойчы вывучала яе характарыстыку й пастанавіла, што «зьняволеная ня стала на шлях выпраўленьня». Нагадаем, праваабаронца **Кацярына Садоўская** асуджаная на 2 гады пазбаўленьня волі.

####Ператрус у Шылы

У салігорскага «маладафронтаўца» **Івана Шылы**, супраць якога пачалі крымінальную справу, адбыўсяператрус. Кіраваў працэдурай маёр салігорскага КДБ Дземідовіч С.М.Ператрус працягваўся 2,5 гадзіны. Спэцлужбісты канфіскавалі нататнікі Івана, значкі, прэсу. Іх зацікавіў камптар хлопца, у якога адсутнічаў сыстэмны блёк.

### 13 траўня

#### Акцыі ў падтрымку касьцёла сьвятога Язэпа

Менскія актывісты павесілі на мосьце на вул.-Няміга расьцяжку з заклікам «Абаронім касьцёл 16 траўня, у 19.00». Расьцяжка правісела на мосьце каля гадзіны, пакуль яе не зьняла міліцыя. Былі распаўсюджаныя ўлёткі з заклікам прыйсьці на супольную малітву за вяртаньне касьцёлу вернікам, якая адбудзецца 16 траўня, у Дзень беларускай салідарнасьці. Каля самога храму адбываўся збор подпісаў у яго падтрымку.

#### Сход інтэлігенцыі ў лесе

IV сход прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі з удзелам 100 дэлегатаў з розных рэгіёнаў краіны адбыўся ва ўрочышчы Прыстанька Стаўпецкага раёну, на беразе Нёману. На тым самым месцы, дзе 9 ліпеня 1906 г. прайшоў нелегальны зьезд беларускіх настаўнікаў з удзелам Якуба Коласа.



WWW.SALIGORSK.ORG

Удзельнікі сходу абралі 47 дэлегатаў на Кангрэс дэмакратычных сілаў і ўхвалілі зварот з шэрагам патрабаваньняў да ўлады.

### 14 траўня

#### Дашкевіча вярнулі на тартак

Палітвязень **Зьміцер Дашкевіч** зноў працуе ў калёніі на лесапільным ўчастку. Раней ён быў зьмешчаны ў турэмны шпіталь з-за праблемаў з хрыбтом. Болей за тыдзень ад Зьмітра не было зьвестак. Цяпер ён паведаміў праз знаёмых, што працуе зноў там, дзе і працаваў.

#### Тацяна Севярынец зьвярнулася ў суд

Маці палітыка Паўла Севярынца **Тацяна Севярынец** зьвярнулася ў суд Першамайскага раёну Віцебску — яна патрабуе аднавіць яе на працы ў віцебскай сярэдняй школе №40. Настаўніцу з 35-гадовым стажам звольнілі нібыта за прагулы: начальнік аддзелу адукацыі Першамайскага раёну **Ўладзімер Шлома**, падпісаўшы заяву спн.Севярынец на адпачынак за свой кошт, праз колькі дзён адмяніў рашэньне. Вярнуўшыся з адпачынку, Т.Севярынец даведалася, што прапусьціла шэсьць працоўных дзён. Бараніць інтарэсы настаўніцы ў судзе будзе вядомы віцебскі адвакат **Міхаіл Замалін**. На судовае паседжаньне зьбіраюцца й бацькі вучняў сярэдняй школы №40, дзе Тацяна Севярынец выкладала расейскую мову ды літаратуру.

#### Апазыцыі не далі памяшканьне

Адміністрацыя Палацу Менскага аўтазаводу адмовілася даць прадстаўнікам апазыцыі памяшканьне для правядзеньня 26–27 траўня Кангрэсу дэмакратычных сілаў (КДС). Нагодай для адмовы стала заплянаванае на гэты час у Палацы мастацтваў іншае мерапрыемства.

#### Сьцяг над райвыканкамам

Супрацоўнікі баранавіцкай міліцыі абвінавацілі актывіста «Маладога фронту» **Яраслава Грышчэню** ў дробным хуліганстве. Падставай стаў відэазапіс, зроблены ўначы. Камэра зафіксавала, як «маладафронтавец» на будынку баранавіцкай адміністрацыі замяніў афіцыйны сьцяг на бел-чырвона-белы.

#### Сьцягі ўдзень

У розных раёнах Менску былі вывешаныя нацыянальныя сьцягі. Паблізу ст.м.«Пушкінская» вялізны сьцяг правісеў больш за дзьве гадзіны. Прыблізна ж столькі пралуналі сьцягі ля плошчы Калініна ды Акадэміі мастацтваў. Гадзіну мінакі назіралі сьцяг на даху дому на вул.Харужай, што ў народзе завуць «кукурузінамі». Быў заўважаны сьцяг і ў мікрараёне Лошыца.

Сьцягі луналі і над Салігорскам **(на фота)**.

Такім чынам патрыёты адзначылі гадавіну рэфэрэндуму 1995 г., па выніках якога гістарычная сымболіка была скасаваная, і ўведзеная мадэрнізаваная савецкая.

#### Канцэрт ZET і IQ-48 забаранілі

Супольны канцэрт гуртоў **ZET** і **IQ-48** мусіў адбыцца ў клюбе «Арэна». Паводле неафіцыйнай інфармацыі, пасьля званка з камітэту па ідэалёгіі Менгарвыканкаму кіраўніцтва клюбу адмовілася ад мерапрыемства. Як паведаміў лідэр «ZET» **Лявон Вольскі**, канцэрт перанесьлі ў клюб «Катакомбы».

**СП**





# Песьні Свабоды-3

Ужо ёсьць на дысках.

# Апазыцыйны сельсавет у Калодзішчах

Менскі райвыканкам з трэцяй спробы валявым рашэньнем прызначыў свайго кандыдата старшынём каладзішчанскага сельсавету. Большасьць дэпутатаў застаюцца нязгодныя з гэтым рашэньнем і шукаюць праўды ў пракуратуры.

У часе студзеньскіх выбараў у мясцовыя саветы ў Калодзішчах абралі двух незалежных дэпутатаў: Міхаіла Зуенка і Вольгу Кісьцень. Раённае начальства разам з супрацоўнікамі міліцыі ў ноч на 15 студзеня спрабавалі «выратаваць сытуацыю», аднак новаабраныя дэпутаты апынуліся вопытнымі людзьмі і не дапусьцілі гэтага.

Кажуць, пасьля таго раённае начальства мела вялікія непрыемнасьці. Калі настаў час абіраць старшыню савету, непрыемнасьці пачаліся ў дэпутатаў. Райвыканкам тройчы адхіляў кандыдатуру Анатоля Бурачэўскага, прапанаванага дэпутатамі на пасаду старшыні савету. Замест яго старшынём настойліва раілі абраць Алега Іванька. На трэцюю сэсію савету прыехаў асабіста старшыня райвыканкаму Міхаіл Глінскі ў суправаджэньні вялікай колькасьці міліцыянтаў.

Дэпутаты і гэтым разам прагаласавалі большасьцю супраць стаўленіка раёну і паспрабавалі закрыць сэсію. Аднак Міхаіл Глінскі ня даў гэтага зрабіць: «Будзеце галасаваць усю ноч, пакуль не дасьцё патрэбны вынік». У знак пратэсту сем дэпутатаў з пятнаццаці пакінулі сэсію, тым самым пазбавіўшы яе кворуму. Гэта не перашкодзіла гасьцям правесьці паўторнае галасаваньне і прызначыць свайго кандыдата старшынём сельсавету.

Нязгодныя зь дзеяньнямі раённага начальства дэпутаты склалі скаргу ў абласную пракуратуру, але адтуль яна трапіла ў міжраённую. Неўзабаве прыйшоў адказ, напісаны нібы пад дыктоўку з райвыканкаму. Дэпутатам патлумачылі, што пэўныя пункты рэгляменту каладзішчанскага сельсавету пярэчаць Закону «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні ў Рэспубліцы Беларусь». Міжраённы пракурор І.Шкатула не знайшоў у гэтай справе нагоды для пракурорскага рэагаваньня. Між іншым, у народных абраньнікаў застаюцца пытаньні да апошняй «начной» сэсіі — якім законам тлумачыцца правядзеньне паўторнага галасаваньня, калі сэсія была ўжо закрытая, ці ня зьнік пратакол таго паседжаньня? Маюць дэпутаты пытаньні і да новаабранага старшыні, які дагэтуль займае аплатную пасаду начальніка ЖЭС. На гэтым тыдні дэпутаты падаюць скаргу ў абласную пракуратуру. Нявызначаны пакуль лёс звольненага з пасады выконваючага абавязкі намесьніка старшыні сельсавету А.Бурачэўскага. Яго звольнілі, не атрымаўшы на тое згоды дэпутатаў савету, як таго патрабуе закон. Чакаецца судовае разьбіральніцтва.

«Самае прыкрае, што з намі не захацелі сустрэцца ні ў пракуратуры, ні ў рай- ці аблвыканкаме, ні ў адміністрацыі прэзыдэнта,» — абураюцца дэпутаты. Яны задаюцца пытаньнем, навошта ўвогуле патрэбныя выбары, калі да абраньнікаў народу ставяцца такім чынам. Пакуль закон будзе выкарыстоўвацца адвольна, калі патрэбна кіроўнай вэртыкалі, парадку ня будзе нідзе, мяркуе Вольга Кісьцень. Яна лічыць, што сытуацыя ў Калодзішчах тыповая для ўсёй краіны і выйшла на паверхню толькі дзякуючы актыўнай пазыцыі купкі дэпутатў, што наважыліся супрацьстаяць сваволі.

Пра падзеі ў Калодзішчах не паведаміла ніводная зь дзяржаўных СМІ. Напісала толькі «Народная воля», што дала нагоду старшыні менскага райвыканкаму абвінаваціць дэпутатаў сельсавету ў апазыцыйнасьці. Між іншым, аўтар артыкулу падае адной з прычынаў супрацьстаяньня каладзішчанскіх дэпутатаў і кіраўніцтва менскага райвыканкаму зямельнае пытаньне. Сельсавет валодае надзвычай ласым кавалкам — тэрыторыяй былога вайсковага палігону. Тут плянуецца збудаваць новы комплекс гольфклюбу зь пяцізоркавым гатэлем. Кошты на лепшыя зямельныя надзелы ўжо сягаюць за 30 тысячаў даляраў, а паводле новых расцэнак могуць узрасьці ў 30 разоў. З вэрсіяй газэты пагаджаюцца і апальныя дэпутаты: «Толькі зямля». Варта нагадаць, што былая старшынька каладзішчанскага сельскага савету Тацяна Бонда восеньню мінулага году была абвінавачаная абласной пракуратурай паводле арт. 126 КК (Перавышэньне ўлады і службовых абавязкаў). Ёй закідаюць махінацыі з выдзяленьнем зямельных надзелаў.

**Сямён Печанко**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Прычына канфлікту ў Калодзішчах — барацьба за правы разьмяркоўваць надзелы зямлі.**

# У дыпкорпусе склалася беларускамоўная суполка

Яе душа — гэта, безумоўна, кіраўнік аддзяленьня швэдзкага пасольства **Стэфан Эрыксан**.



Юлія Дарашкевіч

Нагодай для гутаркі з дыпляматам былі дні культуры Швэцыі ў Беларусі, якія пачаліся 17 траўня. Але сама абстаноўка яго кабінэту спрыяла пашырэньню тэматыкі: бел-чырвона-белы сьцяжок на паліцы, партрэт Зьмітра Дашкевіча, падшыўка «Нашай Нівы»...

**«Наша Ніва»: Зь якімі старонкамі швэдзкай культуры знаёміце беларусаў?**

**Стэфан Эрыксан:** Найперш — мастацтва. Летась у Менску, Віцебску і Полацку прайшла выстава швэдзкай графікі. Нашы мастакі праводзілі майстар-клясы. Летась быў і вельмі ўдалы ўдзел нашага фільму «Як на нябёсах» на кінафэсьце «Лістапад», ён атрымаў чатыры ўзнагароды. І сёлета ў кінатэатрах будзе швэдзкае кіно: «Бывай, Фалькенбэрг», «Чортавы правінцыялы», «Віват, кароль!».

Будуць паказы фільмаў і на беларускай мове. Перакладалі маладыя беларусы, якія вывучылі швэдзкую мову.

Наступны пункт — літаратура. У Швэцыю нядаўна прыяжджала дэлегацыя зь незалежнага пісьменьніцкага саюзу, яны мелі сустрэчы з нашымі пісьменьнікамі. Спадзяёмся, хутка зможам выдаць анталёгію швэдзкай літаратуры па-беларуску. Ёсьць багата перакладаў, трэба іх сабраць пад адной вокладкай. Думаем і пра анталёгію беларускай літаратуры па-швэдзку, але тут працэс, мабыць, будзе даўжэйшы.

Летась мы запрасілі ў Стакгольм гурт NRM, у Менск летась прыяжджалі швэдзкія зоркі «The Cardigans».

Важным момантам для культуры нашых краінаў стала перавыданьне кнігі Андрэя Катлярчука «Швэды ў гісторыі й культуры беларусаў». Першае выданьне ужо раскуплена. У новым ёсьць дадатковы матэрыял. Прэзэнтацыя кнігі адбудзецца 17 траўня ў Чырвоным касьцёле.

> Суды, падобныя да таго, які хутка пачнецца над «Маладым фронтам», выклікаюць трывогу ўсёй Эўропы.

**«НН»: Чаму Вы вырашылі перавыдаць гэту кнігу?**

**СЭ**: Катлярчук паказвае, што некалі Беларусь адкрыта глядзела ва ўсе бакі, у тым ліку на поўнач, на Швэцыю. Гэта і ёсьць, пэўна, самае важнае пасланьне кнігі. ХХ стагодзьдзе вінаватае ў тым, што ўзьнікла сьцяна між заходнімі і ўсходнімі эўрапейскімі краінамі.

**«НН»: У галіне літаратуры Вы непасрэдна ўдзельнічаеце ў разбурэньні сьцяны: перакладаючы творы Быкава і Арлова.**

**СЭ**: Я не прафэсійны перакладчык, але вось узьнікла такая ідэя... Пра сьпіс твораў гаварыць ня буду, у мяне шмат знаёмых беларускіх пісьменьнікаў, і хто-небудзь можа пакрыўдзіцца, што перакладаю не яго. А пераклады з Быкава хутка зьявяцца.

**«НН»: Дзейнасьць прадстаўніцтва Швэцыі абмяжоўваецца сфэрай культуры?**

**СЭ:** Мы разумеем, што ў Беларусі ёсьць праблемы з правамі чалавека. Я часам прысутнічаю на палітычных акцыях, судах. Швэцыі небыякава, куды ідзе Беларусь. Суды, падобныя да таго, які хутка пачнецца над «Маладым фронтам», выклікаюць трывогу ўсёй Эўропы.

**«НН»: Упершыню ў Беларусь Вы трапілі ў 1984 г. Што зьмянілася ў краіне?**

**СЭ**: Я быў тады на стажыроўцы ў Маскве і вырашыў наведаць Менск. Беларусь была абсалютна закрытай савецкай рэспублікай. Цяпер бе-

**Стэфан Эрыксан**

нарадзіўся ў 1962 годзе ў Вэстэросе, недалёка ад Стакгольму. Скончыў Інстытут гандлю і эканомікі (1989). Працаваў зь місіямі ў Расеі, Бэльгіі. Зь верасьня 2005 году — кіраўнік аддзяленьня пасольства Швэцыі ў Менску.

ларусы пачуваюцца асобнай незалежнай краінай. Беларусь адкрылася сьвету. Моладзь стала досыць разьняволенай.

**«НН»: Што швэды ведаюць пра Беларусь цяпер?**

**СЭ**: Збольшага ведаюць пра спорт. Маё пакаленьне помніць гімнастку Корбут. Таксама добра памятаюць хакейны матч на Алімпіядзе-2002, калі беларусы аказаліся мацнейшымі. Ведаюць таксама, што палітычная сытуацыя ў Беларусі не такая, як у іншых эўрапейскіх краінах. Ведаюць пра падзеі Плошчы, што шмат людзей пасадзілі за краты, што некаторыя палітыкі сядзяць і цяпер.

**«НН»: Ад камплімэнтаў у адрас сваёй беларускай мовы не стаміліся?**

**СЭ:** Для мяне вывучыць беларускую мову было натуральнай патрэбай, ва ўсіх краінах, дзе працаваў, вывучаў мовы. Я таксама прадстаўнік невялікага эўрапейскага народу, таму лічу, што кожная мова каштоўная для агульнай эўрапейскай прасторы. Мне беларуская вельмі падабаецца. І мая мова выклікае ў людзей толькі станоўчыя рэакцыі.

**«НН»: З кім з прадстаўнікоў дыпкорпусу размаўляеце па-беларуску?**

**СЭ**: Зьехаў Крол, зь ім мы размаўлялі, але спадарыня Ст'юарт таксама вывучае беларускую. З славацкім калегам часам размаўляем на мове. Новы літоўскі пасол Багдонас паабяцаў, што праз паўгоду вывучыць беларускую. Канечне, пасол Ізраілю. Так што невялікая беларускамоўная суполка ў нас ёсьць.

**«НН»: Адчуваеце, што за паўтара году ў Беларусі Вы сталі адным з самых пазнавальных дыпляматаў, акрэдытаваных тут?**

**СЭ**: Вы так думаеце? Вядома, мая мэта — каб болей людзей ведала пра Швэцыю.

**«НН»: Якія ў вас зацікаўленьні ў жыцьці?**

**СЭ**: Раней былі хобі, цяпер амаль усе замяніла праца. Вельмі люблю вандраваць, адкрываць для сябе новыя месцы, краіны. У Беларусі быў некалькі разоў у Горадні, Віцебску, Пінску, Полацку. У суботу мяне вазілі ў Бабруйск. Нечакана горад аказаўся вельмі цікавым. Канечне, Наваградак, Мір, Нясьвіж, Белавеская пушча. Хачу наведаць палескія балоты.

**«НН»: Ці часта Вы наведваеце Радзіму?**

**СЭ**: Прыкладна раз на два месяцы я там бываю. У мяне нават няма тамака кватэры. Дакладней, яна ёсьць, але мы яе здаём ужо шмат гадоў. Мая мэбля, рэчы тут. На сёньня ўсё ж Швэцыя — мая Радзіма, а Беларусь — дом.

**«НН»: Вам чаго-небудзь не хапае ў Беларусі?**

**СЭ:** У Менску ў мяне стаіць спадарожнікавая талерка, якая ловіць швэдзкія каналы. Ежа ня так ужо і адрозьніваецца. Беларуская гарэлка і піва ня горшыя за эўрапейскія. І клімат падобны. Ёсьць падабенства між сьвятамі. У нас ёсьць сьвята ў сярэдзіне лета, у вас — Купальле. У вас у лістападзе Дзяды, у нас дзень усіх сьвятых. Беларусь для мяне не экзатычная краіна, эўрапейская краіна. Швэду нядрэнна жыць у Беларусі.

**«НН»: Ваш працоўны стол абсталяваны для работы стоячы...**

**СЭ**: Ой, гэтае пытаньне сапраўды надакучыла. (Сьмяецца). Гэта такая швэдзкая інавацыя. Звычайна з ранку я стаю, пасьля абеду, калі стаміўся, я яго апускаю. Лічыцца, што працаваць стоячы лепш для сьпіны. Я так працую ўжо два гады і мне падабаецца.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**



## Бервяно ва ўласным воку

**Напярэдадні Дня Перамогі ў Гомелі бульдозэр зруйнаваў помнік вайсковай гісторыі — драўляны дом нумар 46 па вул.Пляханава, дзе ў 1941—42 гадах знаходзілася падпольная явачная кватэра.** Непадалёк пачалося будаўніцтва новага мосту цераз Сож, і дом трапіў у зону зносу, але пра тое, каб разабраць яго па бярвенцах і адначасова навіць на новым месцы, як гэта робяць у цывілізаваным грамадзтве, гаворкі не было. Дом ператварылі ў кучу сьмецьця, а непатрэбную мэмарыяльную дошку ўлады ўрачыста падарылі 9 траўня мясцовай вэтэранскай арганізацыі. Ніхто ня біў вітрыны на вуліцах, што носяць імёны Барадзіна, Цімафеенкі, Шылава, Жалезьнякова — падпольшчыкаў, чый апошні год жыцьця быў зьвязаны з домам на Пляханава. Натоўп падпітай моладзі, што вярталася пасьля салюту дадому, не зважаў ня толькі на чорныя руіны будынку, але і на правілы дарожнага руху, а сьвяточна апранутыя міліцыянты цярпліва выслухоўвалі скаргі пра «скрадзеныя» мабільнікі…

«К этому акту вандализма относимся отрицательно», — стракацяць бліц-апытаньнямі газэтныя аркушы. Ды, вядома ж, гаворка там ідзе пра іншыя падзеі ў іншай краіне. Няпроста заўважыць бервяно ва ўласным воку.

**Сяргей Баранаў, Гомель**

## Бел-чырвона-белы сьцяг у Лунінцы

**У Лунінцы падчас таварыскага матабольнага матчу паміж мясцовай камандай** «Палесьсеэлектрамаш» і летувіскай «Мілдай» некалькі маладзёнаў узьнялі бел-чырвона-белы сьцяг. Яны яго трымалі 15 хвілінаў, пакуль не падышоў міліцыянт і не загадаў прыбраць. Людзі зь цікавасьцю назіралі. “А што, — казалі, — а правільна!”. Міліцыянт паводзіў сябе карэктна.

**Мясцовы**

**P.S.** Нашы перамаглі 2:1.

## Шрыфт не павялічвайце

**Добрага здароўя Вам, шаноўная «Наша Ніва», мая газэта! Вялікі дзякуй Вам, што Вы ёсьць. Пішу Вам мой водгук на допіс пана Івана Цімафейчыка («НН», №15).**

Я не расьпілоўваю «НН», бо гэта не бервяно. Разгортваю да сярэдзіны (раблю адзін рух рукамі), кладу на стол і адным рэзам нажа зьверху газэты разразаю адразу ўсе старонкі. Чытаю без запояў і заедаў, але з думаньнем.

І газэты, і часопісы, і кнігі я чытаю праз лупу. Вельмі зручна і танна для выдаўцоў, і ашчадна. Пагэтаму шрыфт не павялічвайце, а ўсе падсьлепаватыя чытачы няхай набудуць сабе лупы, яны танна каштуюць, і зручныя для карыстаньня, і ёсьць у продажы, і даўгавечныя пры належным абыходжаньні.

**Барыс Сакалоўскі, Іскра, Сьветлагорск**

## Узыходзяць парасткі новай Беларусі

**Як душа чалавека жывая, так душа народу ёсьць яго мова.** Пакуль жывая мова, датуль жывы народ. А тое, што нас такіх мала, дык ня трэба ўпадаць у адчай. Сказана: «Шмат званых, ды мала абраных». Сапраўды, хрысьціянаў было мала, але яны паклалі пачатак новай эры ў гісторыі чалавецтва. Наш народ не пракляты Богам. Ад гэтай эліты нацыі і пойдзе новы народ. Як лепш пабудаваць новы дом, чым рамантаваць стары, дзе ўсё развальваецца, так і Госпад будуе ўсё новае. Цяпер мы жывём у эпоху, калі ўзыходзяць парасткі новай Беларусі. Усё мы зможам і пераможам.

Артур, Павал, Дзіма, Барыс, другі Дзіма, Алег, Наста і іншыя, хто знаходзіцца пад перасьледам! Ня бойцеся, Госпад вас правядзе празь любыя выпрабаваньні (Псальм 22:4). Толькі верце.

**Сяргей зь Бегам'я**

## А памылак жа — няма

**Пачытаў допіс І.Крамко «За чысьціню мовы» («Наша Ніва», 27.04.2007).** Якую *чысьціню* мае на ўвазе аўтар, калі ўсе разгляданыя ім словы і выразы ўжыты ў адпаведнасьці з нормамі, кадыфікаванымі працамі Інстытуту мовазнаўства НАН, у тым ліку «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» (далей — ТСБМ)?




**Лягатып сёлетняга фэстывалю «Басовішча» распрацаваў Міхал Анемпадыстаў. Найбольшы фэстываль незалежнай беларускай музыкі адбудзецца 20—21 ліпеня ў Гарадку на Беласточчыне.**

Словазлучэньне *задавацца пытаньнем* І.Крамко кваліфікуе як памылковае. У сапраўднасьці яно агульнаўжывальнае, літаратурнае. А вось *задавацца пытаньнем* і *задаваць пытаньне* — далёка ня тое самае.

І.Крамко катэгарычна не прымае выразу *спавядаць прынцып*. Насамрэч мове ўласьціва слова *спавядаць* са значэньнем «прытрымлівацца якога-небудзь вучэньня, пераканаьня і пад.».

Аўтар крытычных заўваг лічыць, што нельга пісаць (казаць): *вучыць мову*, а трэба толькі: *вывучаць мову*. І ў гэтым разе ня мае рацыі. ТСБМ у слове *вучыць* фіксуе значэньне «вучыць, засвойваць, запамінаць». Калі кажам: *вучыць літары*, чаму нельга *вучыць графіку, вучыць* (усю) *мову*? Так і ўжываецца гэтае слова. Асабліва ў гутарковым стылі.

У апошнім абзацы І.Крамко канчаткова заблытаўся зь дзеясловамі і іх катэгорыямі. Працытаваўшы з газэты сказ: «У 1982 паступае ў Рыскую духоўную сэмінарыю, сканчае ў 1987», ён піша, што дзеяслоў *сканчае* (на думку І.Крамко, яго інфінітыў — *скончыць*) ня мае формы цяперашняга часу. Папраўдзе ж дзеяслоў *сканчае* (інфінітыў *сканчаць*) ужыты ў форме цяперашняга часу.

У мове ёсьць парныя дзеясловы *кончыць — канчаць, скончыць — скончваць, сканчаць, закончыць — заканчваць (закончваць)*. І памылкі, уласна, тут няма.

Патрабаваньні чысьціні, правільнасьці і дакладнасьці актуальныя для мовы ня толькі газэт, але і тых, хто яе аналізуе, ацэньвае.

**Алесь Каўрус, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Увага!

Каб рэгулярна атрымліваць газэту, вам трэба проста падпісаць дамову на яе пакупку і перавесьці грошы праз банк.

Дамову трэба падпісаць і даслаць на адрас Рэдакцыі (220050 Менск а/с 537) не пазьней за 25 мая.

Аплату па квітанцыі вам трэба зрабіць не пазьней за 1 чэрвеня. Квіток пра аплату перасылаць ня трэба, ён аўтаматычна прыйдзе нам з банку.

Дарагія людзі! Сёньняшняя «Наша Ніва» — гэта ўнікальная зьява, беспрэцэдэнтны выпадак у нацыянальнай гісторыі, калі газэта выходзіць і распаўсюджваецца сваімі сіламі, з апорай на чытачоў. Вашы дзеці і ўнукі будуць распытваць Вас пра гэты час і гэтую газэту.

Не стамляйцеся падпісвацца, а таксама падпісваць суседнія школы, вучэльні, офісы, асяродкі, цэрквы — там, дзе газэта ня будзе прападаць. Прачытаўшы газэту, перадавайце яе школьнікам, студэнтам, пакідайце ў цягніках, цырульнях, усюды, дзе яе могуць прачытаць іншыя людзі, якія яшчэ ня ведаюць, што незалежныя газэты ёсьць, выходзяць.

Пераможа вытрываласьць.

**Ваша «Наша Ніва»**

**Па пытаньнях дастаўкі газэты зьвяртайцеся да Рамана:**
**(017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84**
**e-mail: dastauka@tut.by**

# Дзякуй

**Уладзімеру Ж., І.К., В.Г.** зь Менскага раёну.
**Леаніду В.** з Лагойскага раёну.
**Міхаілу Ш.** з Клімавіч.
**Анатолю Ц.** з Асіповіч.
**Аляксандру А., Г.К., Аляксандру С., У.К.** з Горадні.
**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.
**Алене Дз.** з Наваградку.
**Фёдару К.** з Талачына.
**Уладзімеру Л.** з Смургонскага раёну.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.
**Генадзю Л., Сяргею К., Зьмітру Т., Алене П.** з Гомеля.
**Тамары Ш., Сержуку Р.** зь Бярозаўскага раёну.
**Аляксандру А., Т.Б., Д.** з Магілёва.
**А.П.** са Жлобіна.
**Паўлу Д., Віктару А., Аляксандру К.** зь Берасьця.
**Сяргею І.** з Салігорску.
**В.К., Сяргею С., Аляксандру З.** з Полацку.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828 | | | | | |
| МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764 | | | | | |
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | | Асабовы рахунак | | |
| (прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас) | | | | | |
| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828 | | | | | |
| МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764 | | | | | |
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | | Асабовы рахунак | | |
| (прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас) | | | | | |
| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пераказваць на рахунак** газэты грошы з разьліку 8000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 24000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 48000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

# Іншае жыцьцё

## «Мір — гэта вайна»

Славутая оруэлаўская формула «Мір — гэта вайна» жыва прыгадалася ў травеньскія дні, калі беларускія тэлеканалы спаборнічалі з расейскімі ў выкрываньні «эстонскага фашызму» ды рознага роду «фальсыфікатараў гісторыі».Тон у «спаборніцтве» задавалі кіраўнікі дзьвюх дзяржаваў.

Колькі апошнім часам гаварылі пра непераадольныя супярэчнасьці, у тым ліку псыхалягічныя, Лукашэнкі й Пуціна. Але 9 Траўня, якое аднолькава адзначаецца ў абедзьвюх дзяржавах, абодва гаварылі адно й тое ж. І нават аднолькавымі словамі, на аднолькавай мове.

«Цяперашнія прэтэндэнты на сусьветнае панаванне спрабуюць выкарыстаць вайну ў якасьці інструмэнту зьнешняй палітыкі, з дапамогай сілы адстойваюць свае геапалітычныя і драпежніцкія інтарэсы, душаць тыя дзяржавы, якія сталі на незалежны шлях разьвіцьця». Гэта з прамовы кіраўніка Беларусі ў Менску. А вось што казаў Пуцін перад парадам у Маскве аб прычынах Другой усясьветнай вайны і сучасных пагрозах: «У нашыя дні такіх пагрозаў не становіцца меней. Яны толькі трансфармуюцца, мяняюць аблічча. І ў гэтых новых пагрозах, як і за часам трэцяга райху, — выключнасьць і дыктат».

Розьніцы, фактычна, ніякай. Пад «прэтэндэнтамі на сусьветнае панаваньне» і «трэцім райхам» маецца на ўвазе адзін і той галоўны вораг — Злучаныя Штаты Амэрыкі. Расейскі МЗС, дарэчы, мусіў потым даваць тлумачэньні Беламу Дому — маўляў, расейскі прэзыдэнт у сваім выступе і ня думаў крыўдзіць ЗША, параўноўваючы іх з гітлераўскай Нямеччынай.

Але ў Расеі ўсе цудоўна зразумелі, каго і што меў на ўвазе Пуцін, які абазначыў «новы курс» на халодную вайну у дачыненьнях з Захадам яшчэ ў сваёй Мюнхэнскай прамове. Цудоўна зразумелі і пасаж пра Эстонію, якую Пуцін асудзіў, не называючы.

Кіраўнік Беларусі быў менш дыпляматычным. Ён проста казаў пра «дэмантаж помніка Воіну-вызваліцелю ў Таліне», пра «закрыцьцё польскімі ўладамі савецкай экспазыцыі ў Асьвенцыме» (якой ніколі не было). За словамі пасьледвала справа. Пікетоўцы зь ліку вэтэранаў і бээрэсэмаўцаў ля эстонскага консульства ў Менску спалілі дзяржаўны сьцяг Эстоніі.

Аб’ектам прапагандысцкіх нападаў усьлед за эстонцамі сталі палякі. Гэта гаворыць аб тым, што падзеі ў Таліне — толькі зачэпка для распальваньня канфрантацыі з Эўрасаюзам і ЗША.

Палякі пацярпелі ў вайне ня менш за беларусаў і расейцаў. І пра магілы сваіх, а таксама й савецкіх жаўнераў дбаюць. Між іншым, яны з гітлерцамі ваявалі ад першага дня Другой усясьветнай, а не ад 22 чэрвеня 1941-га. Але даводзіць гэта людзям, якія жывуць уяўленьнямі, быццам Прыбалтыка, Беларусь і Украіна, Грузія і Малдова — расейская тэрыторыя, а былыя краіны сацлягеру павінны кожны крок узгадняць з Крамлём — гэтым людзям даводзіць, што яны памыляюцца, няма сэнсу. Тое самае, што даводзіць заалягічным антысэмітам, што Галакост быў пачварным злачынствам перад чалавечнасьцю. Цікава, дарэчы, што за адмаўленьне факту Галакосту ў Эўропе судзяць, а вось ухваляць яго можна — за гэта нічога ня будзе. І апаганьваньне габрэйскіх могілак у Эўропе, у тым ліку ў Беларусі, даўно зрабілася рэччу звыклай.

## «Увесь асабовы склад...»

Закладнікам рыторыкі халоднай вайны зрабіліся ня столькі краіны былога «сацлягеру» (у іх ёсьць пакуль абарона ў выглядзе ЭС і НАТО), колькі Беларусь.

Але перш чым гаварыць аб гэтым, варта ўспомніць яшчэ раз пра тое, што зрабілася ўсяго толькі падставай для палітычных спэкуляцыяў. Пра Дзень Перамогі і пра тых, хто за яе ваяваў.

Усе загіблыя ў барацьбе зь нямецкім фашызмам заслугоўваюць пашаны. Гэта нават ня варта абмяркоўваюць. Гэта катэгарычны імпэратыў. Як і тое, што ня трэба чапаць магілаў і ўсчыняць палітычныя гульні вакол іх.

Ня меншай павагі заслугоўваюць і тыя, хто дажыў да нашых дзён. Але зь іх заслугамі і ўзнагародамі, дзякуючы дзяржаве, адбылася непрыемная рэч — дэвальвацыя. Прывяду меркаваньне расейскага дасьледчыка-калекцыянэра, былога франтавіка А. Шчолакава зь яго кнігі «Захапляльная геральдыка».

«Савецкай сыстэме было ўласьцівае ўсталяваньне ўзнагародаў, якія, паводле народнага выразу, уручаюцца за «дажываньне», у сувязі зь нейкімі памятнымі ці юбілейнымі датамі.

Якія сур’ёзныя прычыны маглі прымусіць урад адзначаць узнагароднымі мэдалямі 1500-годзьдзе Кіева, 800-годзьдзе Масквы, 250-годзьдзе Ленінграда? Каго і за якія заслугі імі адзначалі? Адказ даюць палажэньні аб мэдалях: «Мэдалём у памяць 1500-годзьдзя Кіева» ўзнагароджваюцца… асобы… якія пражываюць у Кіеве ці яго прыгарадах ня менш за 10 гадоў» (1982 г.)

Далей А.Шчолакаў піша: «У канцы Вялікай Айчыннай вайны мэдалямі «За перамогу над Нямеччынай» былі ўзнагароджаныя 15 млн чалавек, «За перамогу над Японіяй» — каля 2-х млн, мэдалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне» дзяржава адзначыла звыш 16 млн чалавек.

У 1965-м Вярхоўны Савет СССР засноўвае мэдаль «Дваццаць гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.» Узнагароджваецца «ўвесь асабовы склад Узброеных Сілаў і іншыя асобы, узнагароджаныя мэдалём «За Перамогу над Нямеччынай у Вялікай Айчыннай вайне»

«За якія, прабачце, заслугі, звыш тых, якія былі прызнаныя і адзначаныя яшчэ ў 1945-м, прызначылі гэтую «ўзнагароду?» — задаецца пытаньнем былы франтавік. Такі самы мэдаль ён атрымаў і да 30-годзьдзя Перамогі. «Мэдаль да 60-годзьдзя Перамогі я атрымліваць ня стаў. Выявілася, што трэба прад’явіць дакумэнты. Якія? Ветлівая пані па тэлефоне патлумачыла: «Тыя, якія пацьвярджаюць, што вам належыць узнагарода».

Для чалавека, які загадзя ведае, калі і якая яму «належыць узнагарода» — яна перастае быць узнагародай і становіцца сувэнірным значком».

На завяршэньне тэмы аўтар са зьдзіўленьнем адзначае, што цяперашняя сыстэма ўзнагародаў Расеі працягвае традыцыі савецкай. Ордэн Жукава ўручаецца военачальнікам, якія маюць званьне Героя Савецкага Саюза. Ордэн за ордэн. Падобнай практыкі, адзначае дасьледчык, няма больш ні ў адзінай краіне сьвету.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## «Нікога не змаглі вызваліць...»

Прашу прабачэньня за доўгую цытату. Мне падалося важным сьведчаньне сумленнага чалавека зь іншай дзяржавы, які ваяваў, які быў і ёсьць расейскім патрыётам і не адмаўляецца ад савецкага мінулага. Ці шмат у яго пасьлядоўнікаў сярод вэтэранаў у Расеі ці ў сёньняшняй Беларусі? Думаю, не.

Інакш колькасьць вэтэранаў, абвешаных з галавы да ног узнагародамі (у асноўным, апісанымі вышэй), у сьвяточных шэсьцях на вуліцах сталіцы даўно б рэзка скарацілася. Можна ўявіць абурэньне многіх з тых вэтэранаў, хто прачытаў бы фрагмэнт цытаванай кнігі.

Але бясконцыя «ўзнагароды за ўзнагароды», хваласьпевы і выстаўленьне вэтэранаў у якасьці сьвятарных кароваў (пра якіх дзяржава забывае адразу пасьля сьвята) ня толькі не дадаюць ім гонару, але й зьяўляюцца зьдзекам з памяці іх памёрлых сяброў. Дый зьдзекам з памяці аб вайне зь яе мільёнамі ахвяраў увогуле.

Лейтэнант мэдслужбы, ветэран і інвалід вайны Алена Бонэр (удава акадэміка Сахарава) напісала на расейскім сайце «Грані» 9 траўня наконт «вызваленьня Эстоніі» вельмі каротка і проста: «Нікога мы не вызвалялі ды й сябе не змаглі вызваліць, хоць чатыры гады спадзяваліся на вызваленьне. Нават казалі: «Пасьля вайны — калі дажыву — усё жыцьцё будзе іншым». Не атрымалася. Ні ў 1945-м, ні ў 1991-м».

Такіх людзей, як Бонэр, засталіся адзінкі. Ды й яна жыве цяпер за мяжой.

Ужо налета 9-га Траўня на Краснай плошчы пойдуць танкі. А на трыбуне Маўзалея будзе стаяць калі ня Пуцін, дык яго клон — клон Андропава, Брэжнева, Сталіна. А ўсьлед за імі, з розьніцай у гадзіну, у Менску будуць маршыраваць беларускія вайскоўцы. За каго і за што яны будуць гатовыя аддаць жыцьцё? За незалежнасьць? Хацелася б верыць.

Але ёсьць тут і адваротны бок справы, які тычыцца беларусаў. Я маю на ўвазе тых, якія прынцыпова ня хочуць прызнаць мінулую вайну важным пэрыядам у гісторыі Беларусі. Паколькі беларусы да таго часу не сфармаваліся як нацыя, лічаць гэтыя філёзафы ды гісторыкі, у іх не было сьвядомага стаўленьня да вайны, не было нянавісьці да нямецкіх акупантаў. Яны былі альбо ахвярамі, альбо — калі прыйшла савецкая армія — гарматным мясам. Гэта быў проста гіганцкі катаклізм, пра які трэба як мага хутчэй забыць.

Такое ўражаньне, быццам і не было ў беларускай літаратуры ні Адамовіча зь яго «Карнікамі», ні Быкава з «Сотнікавым». Ці яны не належаць да беларускай культуры, і іх чалавечы й мастацкі досьвед ня мае дачыненьня да беларускага народу. Няўжо, калі выкрасьліць з гісторыі бээсэсэраўскі пэрыяд, з вайной і партызанкай, мы атрымліваем лябараторна чыстую беларускую нацыю?

Ды й адкуль жа ёй узяцца? З гісторыі ВКЛ, з Грунвальда? Зь легендаў і казак? Тыя легенды не бліжэй да рэчаіснасьці, чым фільмы пра вайну, якія круцяць на БТ.

Беларусы жылі апошнія сто гадоў, як і папярэднія стагодзьдзі, на сваёй зямлі, а не на Марсе. І ад таго, што яе таптаў й гвалтавалі акупанты, яна не перастала быць Беларусьсю. Толькі ня той, аб якой мараць нашыя інтэлектуалы...

Гэта ня значыць, што за саветамі жыць было добра. Гэта значыць, што ўсё трэба памятаць. Без выключэньняў. Ня можна выбраць з гісторыі харошыя, цікавыя старонкі і «выдраць» кепскія.

І няўжо тая частка беларусаў (пераважная, між іншым, частка), якая пайшла ў партызаны ці ў савецкую армію, супрацоўнічала зь імі, не заслужыла права звацца беларусамі?

Можна як заўгодна ацэньваць той пэрыяд гісторыі зь сёньняшніх акадэмічных вышыняў, гаварыць, што саветы былі для Беларусі такім самым злом, як і немцы. У рэальнасьці жывыя людзі сутыкаліся не з абстрактным, а з цалкам рэальным злом. Забівай іншых — альбо будзеш забіты сам. І трэба было рабіць маральны выбар. І подласьць тады была подласьцю, годнасьць — годнасьцю, баязьлівасьць — баязьлівасьцю, мужнасьць — мужнасьцю. Як і цяпер, дарэчы.

Мы павінны ведаць, чым насамрэч была вайна, колькіх яна каштавала ахвяраў, але гэта не здымае з нас маральнага абавязку перад бацькамі, якія гінулі ў барацьбе за радзіму і свабоду. Тое, што яны не змаглі адстаяць ні таго, ні другога, не прыніжае іх мужнасьці. Яны не маглі ведаць, што будзе потым. Яны ваявалі і пры гэтым заставаліся людзьмі. У большасьці сваёй.

Але ці шмат засталіся людзьмі ва ўмовах «мірнага часу»? Як выявілася, узарваць мост альбо цягнік, ці нават кінуцца на амбразуру часам бывае лягчэй, чым запярэчыць начальству, альбо адмовіцца ад «пайкі» да сьвята.

Канечне, хацелася б жыць у грамадзтве, дзе няма патрэбы ў гераізьме і мужнасьці. Прынамсі, штодня. Нармальны чалавек у нармальным жыцьці мусіць ісьці на нейкія кампрамісы з сабой і абставінамі.

Але тым больш ня варта глядзець з грэблівасьцю нэафітаў на пакаленьне бацькоў, якія не зразумелі таго, што, нібыта, разумеем мы. Яны зрабілі тое, што маглі. А некаторыя нават крышачку больш.

Мы яшчэ не зрабілі нічога, каб мець права іх крытыкаваць. І каб прыйсьці на іх магілы з чыстым сумленьнем.

# Эўрагледзішча і эўравідовішча

Чым больш несвабодная краіна, тым радзей яна прывязе на «Эўрабачаньне» нешта непаўторнае, запяе на ўласнай мове. Піша **Тэда Лі**.

Скончылася чарговая музычная спартакіяда, і цяпер можна перабінтаваць раны і паглядзець, што мы зрабілі ня так. З кожным годам Эўравізія для Беларусі ўсё больш набывае значэньне спорту. Адную за адной страчваючы надзеі сьцьвердзіцца на іншых пляцоўках, Беларусь чакае вынікаў ад змагара зь мікрафонам.

Чацьверты ўдзел нашай краіны ў Эўравізіі нарэшце прынёс пэўны плён. Наступны раз проста ня трэба разьлічваць выключна на расейскамоўнага гледача, які змог бы прасячы дасьціпнасьць, зьвязаўшы пераклад Калдуновага прозьвішча з адмыслова дарэчнай назвай яго песьні (між тым, па-беларуску калдун — гэта дранік зь мясам, пяльмень).

Гледзячы на посьпех суседзяў па кантынэнце, можна шмат чаму навучыцца і падрыхтавацца да Эўравізіі'08 так, каб у наступным годзе нават балканскія краіны, дагэтуль верныя свайму гістарычнаму братэрству, выставілі нашай краіне найвышэйшую адзнаку.

Агледзеўшы фаварытаў публікі дый усіх астатніх, можна вылічыць кампанэнты перамогі.

## Камплект аднаразовых герояў

Той факт, што Эўравізія ўжо даўно не зьяўляецца конкурсам *песьні* дый наагул музычнай імпрэзай, цяпер вядомы бадай што кожнаму. Вазіць на фэстываль менавіта песьню ўжо нікому нецікава. Лічыцца, што ў расьпешчанага слухача даўно адваліліся вушы, і цяпер можна падлавіць яго хіба што на якім-небудзь прыхаваным комплексе (сэксуальнасьць, гіпэрсэксуальнасьць, гомасэксуальнасьць, транссэксуальнасьць, нешта іншае).

Сёлета толькі адна краіна прэзэнтавала на пляцоўцы ў фінскай сталіцы паўнавартасны музычны твор. Сьпявачка Sopho з Грузіі была адзіным чалавекам, чыя разьняволенасьць на сцэне цалкам адпавядала кампазыцыі, якую яна прывезла з горных і вінных краёў. Нічога так ня цешыць, як сьпявак, які кайфуе падчас выкананьня.

Аднак Sopho па выніку заняла толькі 12-е месца, атрымаўшы адзіны найвышэйшы бал ад Літвы. Наўрад ці ісляндзкая зорка Bjork, чый уплыў моцна адчуваўся ў сьпеве, манерах, электроннай кампазыцыі і нават гучаньні скрыпачак грузінскага нумару, спадабалася б эўрапейскай публіцы больш. Публіцы ўсё роўна, хто ты, калі ты не патрапляеш у тое схаванае, інтымнае, непрыстойнае месца, дзе ёй толькі што засьвярбела.

Швэдзкія глэм-рокавыя зоркі — гурт The Ark — таксама не займелі посьпеху ў гледачоў шоў-алімпіяды. Стваральнікі шматлікіх знакавых кампазыцыяў прывезлі ў Хэльсінкі супэраблегчаную вэрсію сябе, затое выглядалі ненавязьліва, лёгка, какетліва, ні на крок ад эстэтыкі бліскучых 70-х.

Асабліва паказальным застанецца выступ знакамітага на ўсю Зямлю дыджэя Bobo, які, прыехаўшы заваёўваць Эўропу (што для зоркі такога маштабу, здавалася б, раўназначна гульні ў фанты), вярнуўся ў родную Швайцарыю, так і не прайшоўшы ў фінал.

## Блакітна-ружовы вожык-трансвэстыт

Эўрапейскіх мужчын і жанчын, калі хто ня ведаў, адрозьніваць робіцца ўсё цяжэй. Даўганогія бэстыі зь бліскучымі валасамі выцясьняюцца людзьмі бяз полу, кічовымі тэатраламі. Гледзячы на ўсё гэта буйства сьцягоў-вясёлак і кляўнадных амаралаў, Дзяніс Кур'ян за камэнтатарскім мікрафонам ня стрымліваецца: «Паважаныя дамы, не падумайце, што сапраўдных мужчын больш не існуе!» — відавочна, намякаючы на сваю асобу. Аднак пра стыль беларускага камэнтаваньня міжнародных імпрэзаў трохі пазьней.

Калі дацкі мужчына, граючы каралеву драмы, так і не «парваў Эўропу», то ўкраінска-расейскі сымбаль кічу Верка Сярдзючка зрабіла гэта ахвотна і на раз. Праўда, ад эстэтыкі саўковай рэстарацыі і пунсовых ружаў у зубах прыйшлося адмовіцца на карысьць больш зразумелага шырокаму гледачу *фэномэну звар'яцелай жабы*. Crazy Frog гэткі ж антымузычны, ён гэтак жа панішчыў густы ўсёй старой Эўропы, задаўшы найпрасьцейшы біт і паказаўшы найпашлейшую весялосьць.

Першае ж месца ў эўразабегу ўзяла асэксуальная сэрбка Марыя Шэрыфовіч, якая, зрэшты, нікога не сьмяшыла і сьмяшыць не зьбіралася. Ейная перамога даказвае існаваньне агульнаэўрапейскага комплексу культурнай дэградацыі. Прагаласаваўшы за дастаткова сьціплы нефээрычны нумар і сур'ёзную песьню на незнаёмай мове, відаць, можна падлячыць сваю карму, забруджаную папсой, порнасайтамі і спажывецтвам. Тымчасам за назвай «Molitva», як мне патлумачылі знаўцы сэрбскай мовы, хаваецца ўсё тая ж банальная гісторыя пра пусты халодны ложак і антыгероя, які сышоў на пошук новых эратычных прыгодаў.

## І песьню родную люблю я

Дзіма Калдун — цудоўны загарэлы хлопчык, зь нябесна-сінімі вачыма і *эўрастандартнай* песенькай. Ён мог прыехаць зь любой краіны. З усходняй і заходняй Эўропы. Адкуль ён прыехаў — не адкажа ніхто.

Чым больш несвабодная краіна, чым больш яна *пабойваецца* Эўропу, тым менш спадзяваньняў, што на міжнародную сцэну яна прывязе нешта аўтэнтычнае, што яна запяе на ўласнай мове.

Балканскія краіны адчуваюць сябе паўнапраўнымі эўрапейцамі, яны не напружваюцца дзеля англамоўных тэкстаў.

На роднай мове сьпявае опэрная сьпявачка са Славеніі. («Гэта славенскі дыялект сэрбскай мовы», — Дзяніс Кур'ян.)

На роднай мове сьпяваюць французы, апранутыя ў ружовае.

На роднай мове пад раяль, кантрабас, саксафон і трубу — ну сапраўдны Moulin Rouge — сьпявае Роджэр Цыцэра («А вось і нямецкі Фрэнк Сынатра!» — працягвае дзівіць сваёй эрудыцыяй Дзяніс Кур'ян).

З гледзішча гарачага, громагалоснага ды зіхоткага шоў, нашыя суседзі літоўцы сёлета паказалі поўны нефармат. З гледзішча інакшага, сама Літва на сьвяце напамажаных мужыкоў зь бюстам ды сэксапільных школьніц з прагным паглядам — поўны нефармат. Спакой ды інтэлігентнасьць, а яшчэ няўменьне схаваць хваляваньне — перафразуючы вядомую ідыёму, мэнталітэт пальцам не размажаш. Тое ж самае сёлета адбы-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Дзьмітрыя Калдуна сустракаюць у аэрапорце «Менск-2»..**

лося і з адзінымі, хто ацаніў Літву найвышэйшым балам. Ірляндыя (якая, між іншым, мае ажно сем перамог на фэстывалі) паўстала перад эўрапублікай кранальным калектывам зь лёгкім кантры, акурат для вясновага ірляндзкага барбекю. І заняла апошняе месца.

Можа быць, калі не хаваць Беларусь у зарэпэтаваных танцах і чужых безаблічных песьнях, мы і будзем выглядаць, як да сьмерці перапалоханая дзяўчынка, якая аб'яўляла ўсёй Эўропе нашыя балы. Зь іншага боку, наша мэнтальнасьць — сэнтымэнтальнасьць, мы менавіта такія: нясьмелыя, дзіўныя і закрытыя. Зрэшты, што я кажу: у нас жа тут СПАРТАКІЯДА!

## Асобнае слова

Можа быць, народ у нас ня надта сьмелы, затое з камэнтатарам Дзянісам Кур'янам яму пашанцавала. Выпускнік журфаку БДУ дзёрзка, з радаснай фаміьярнасьцю абсьцябаў кожнага другога ўдзельніка эўрапараду, ледзьве выжыў падчас выступу гурту The Ark, «дасьціпнічаў» у бок босай вугорскай сьпявачкі Магды Русы і францускага дуэту Les Fatals Picards, а сэрбскую пераможцу Марыю з запалам называў пастарэлым Гары Потэрам ды карэйскім хлопчыкам. Відавочна, Дзяніс, які пачынаў сваю імклівую кар'еру з падлеткавага ток-шоў «5х5», так дагэтуль і ня выкараскаўся з фармату сюжэтаў пра шаснаццацігадовых скейтбардзістаў.

Так ці інакш, радуючыся ці злуючыся, сьмеючыся ці абураючыся, у гэтым годзе Эўравізію глядзела больш маладых людзей, чым летась. Гэта заўважна па нашмат больш ажыўленых, чым мінулай вясной, дыскусіях у віртуальнай ды рэальнай прасторы. Падобна, што падрыхтоўка да Эўравізіі на нейкі час рызыкуе стаць нацыянальнай справай. Добра было б яшчэ, каб нацыя перастала быць бязвольным гледачом і нарэшце навучылася паказваць сябе без дапамогі расейскіх мясных каралёў, поп-цароў і фэшн-прынцаў.

Том **«Беларусь: ні Эўропа, ні Расея»** зьмяшчае інтэрвію з трыццацьцю беларускімі палітыкамі, журналістамі, дзеячамі культуры і мастацтва, праведзеныя ўвесну 2006 году ў Менску. Нашым суразмоўцам былі зададзеныя дзевяць пытаньняў на тэму беларускай ідэнтычнасьці, узаемінаў Беларусі з Расеяй і Эўрапейскім Зьвязам. У выніку паўстаў зборнік, у якім пададзеныя разнастайныя і часам супярэчлівыя меркаваньні на вызначаную тэму.

Даслаўшы замову з пазначэньнем вашага імя, імя па бацьку і прозьвішча, а таксама дакладнага адрасу на адрас 220018, Менск, а/с 3, вы атрымаеце кніжку бясплатна. Просьба пазначаць мову, на якой замаўляецца выданьне: расейскую ці беларускую.

Вольга Абрамава, Сьвятлана Алексіевіч, Яўген Бабосаў, Анжаліка Борыс, Ірына Бугрова, Генадзь Бураўкін, Алесь Бяляцкі, Аляксандар Вайтовіч, Андрэй Вардамацкі, Вінцук Вячорка, Павал Данейка, Андрэй Дынько, Сьвятлана Калінкіна, Сяргей Калякін, Кася Камоцкая, Сяргей Касьцян, Вячаслаў Кебіч, Анатоль Лябедзька, Васіль Лявонаў, Жанна Літвіна, Алег Манаеў, Аляксандар Мілінкевіч, Анатоль Міхайлаў, Алесь Міхалевіч, Тацяна Працька, Андрэй Саньнікаў, Уладзімер Улаховіч, Валеры Фралоў, Станіслаў Шушкевіч, Усевалад Янчэўскі.

**Беларусь: ні Эўропа, ні Расея. Меркаваньні беларускіх эліт.**
Варшава: Выдавецтва «ARCHE», 2006.

# Сапега зьняў аблогу

Прадпрымальніку Мікалаю Сапегу не ўдалося выкупіць і адрэстаўраваць Быхаўскі замак. Рэпартаж з Быхава **Зьмітра Панкаўца**.


АРЦЁМ ЛЯВА

Калі едзеш Быхавам, падаецца, што ўсё будаўніцтва тут спынілася яшчэ ў 1970-я. Разам з тым горад утульны. Ці ён такі заўжды, ці рыхтавалі да візыту Лукашэнкі? Замак — адразу пры заезьдзе ў горад за мастом праз Дняпро. З усіх бакоў аточаны навюткім плотам, пастаўленым пару дзён таму з нагоды згаданага візыту.

У XVI—XVII ст. гаспадары Быхава — князі Хадкевічы і Сапегі —ператварылі яго ў магутную фартэцыю, адну з самых надзейных у Беларусі. Стары Быхаў і яго гераічная абарона адыгралі вызначальную ролю ў вайне з Масковіяй 1654—1667 г. Гісторыкі паўжартам называюць Быхаў «беларускім горадам-героем».

За савецкім часам у сапегаўскім палацы месьцілася мэблевая фабрыка. Ужо гадоў пяць як тамака нічога няма. Заходзім у замак з боку галоўнай брамы. Яна адчыненая, аб’ект даўно ніхто не ахоўвае, і ён паступова руйнуецца.

А дзе ж бізнэсовец Мікалай Сапега, які браўся аднаўляць замак? На працягу двух гадоў прадпрымальнік з магнацкім прозьвішчам арандаваў у замку памяшканьні. Там у яго месьцілася лесапільня. Лесанарыхтоўчы бізнэс даваў вялікія і стабільныя прыбыткі. Тады і ўзьнікла ідэя рэўстарацыі замку з мэтай прыцягненьня ў Быхаў турыстаў.

Набіраю Сапегаў нумар. Мікалай з радасьцю пагаджаецца паразмаўляць, толькі пасьля дадае: «Вы да мяне ў Глуск прыедзеце?..» Цяпер ён жыве там, займаецца фэрмэрствам.

Сапега расказвае, як афармляў дакумэнты, патрэбныя для набыцьця замку, як справу тармазілі то мясцовыя бюракраты, то Адміністрацыя прэзыдэнта. Папяровая валакіта цягнулася два гады. Але прадпрымальнік быў пэўны, што ўрэшце атрымае замак ва ўласнасьць. Нават пачаў рамонт. Паправіў дах, прыбраў з памяшканьняў розны друз. Справа паціху рухалася.

У 2004 г. замак гарэў. Нехта зь мясцовых жыхароў прыйшоў з аўтагенам красьці трубы. Пачаў выразаць іх акурат у пажаранебясьпечнай зоне — у пакоі, дзе некалі мэблю пакрывалі лякам. Замак загарэўся. Міліцыя так і не знайшла вінаватага.

І нават пасьля таго Сапега не кідаў сваёй ідэі. Чаму? Ён раіць зайсьці зірнуць у адну з замкавых вежаў. Падымаюся на другі паверх, хоць, па шчырасьці, страшнавата: праз усю столь праходзіць здаравенная трэшчына. На другім паверсе ня лепей — дах дзе-нідзе паправальваўся, расьце трава, прабіваюцца бярозкі.

Але з акна адкрываецца фантастычны краявід Дняпра і наваколья. Вось чым Сапега зьбіраўся завабліваць турыстаў. Аглядаюся ўнутры вежы: атынкаваныя сьцены, пачышчаны комін, няма друзу на падлозе. Здаецца, што яшчэ трошку часу — і Сапега змог бы давесьці да такога выгляду ўвесь замак.

Але ў канцы 2005 г. выйшлі новыя ўрадавыя пастановы, якія, лічы, забаранілі прыватнікам займацца лесанарыхтоўкамі. Бізнэс заняпаў. На мары пра выкуп замку давялося забыцца.

Спадар Сапега расказвае, што яму неаднаразова тэлефанавалі з прапановай узяць удзел у аўкцыёне па продажы замку: «Пачатковая цана была 360 млн рублёў, але рознымі шляхамі гэтую лічбу можна было зьбіць да 60 мільёнаў», — кажа Сапега. Удвая таньней за менскую аднапакаёўку. Але і такіх грошай Сапега ня мае. Іншых ахвотных набыць замак таксама не знайшлося.

За некалькі сотняў мэтраў ад замку стаіць закінутая абарончая сынагога XVI ст. Яна ў крыху лепшым стане, але і тут відавочна патрабуецца рэстаўрацыя. Усе ўваходы забітыя дошкамі. На сьценах надпісы чорнай фарбай — РНЕ.

Характэрна выглядаюць дахі старых быхаўскіх баракаў. На кожным зь іх дзясяткі спадарожнікавых талерак. Патэнцыйных гледачоў незалежнага тэлеканалу ў горадзе нямала.

За савецкім часам Быхаў быў вядомы тым, што ў горадзе разьмяшчалася база стратэгічнай авіяцыі. Закінуты аэрадром уражвае ня менш за замак і сынагогу. Даўжэзныя і шырачэзныя забэтаваныя ўзьлётныя палосы. Частку бэтоннай пліткі з аэрадрому ўжо вывернулі і паклалі ў горадзе замест асфальту. Згадваецца, што каля замку мы ішлі якраз па такіх плітах. На аэрадроме ж беларускія рокеры маглі б здымаць файныя кліпы, ці нават зладзіць рок-фэст. Але пакуль не відаць энтузіяста, які б за гэта ўзяўся. Хіба Сапега, як адкупіць замак.

*Быхаў—Менск*

# Каналізацыя ў падмурках сабору

У Віцебску, у ахоўнай археалягічнай зоне пракладаюць каналізацыю. На плошчы Свабоды, акурат дзе стаяў комплекс будынкаў Сьвята-Мікалаеўскага сабору, вырылі катлаван. Там запляванае ўзьвядзеньне забаўляльна-піцейнага «Маладзёжнага цэнтру адпачынку», што мае будаваць ТДА «Дан». Там будуць рэстарацыі, піўбар, вінныя скляпы, тэрасы для шашлычных. Рашэньне пра будаўніцтва прынятае Віцебскім гарвыканкамам і ўзгодненае, як кажа намесьнік старшыні гарвыканкаму П.Лосіч, з Упраўленьнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры.



Тэрыторыя гістарычнага цэнтру Віцебску была заселеная яшчэ ў VIII ст., з XII ст. тут месьцілася праваслаўная царква Параскевы Пятніцы з пагостам, пасьля Аляксееўскі манастыр, спалены маскоўцамі. На яго рэштках паўстаў езуіцкі кляштар і драўляны касьцёл сьв.Язэпа. У 1716 г. на сродкі кашталяна Марцыяна Агінскага і віцебскай шляхты езуіты збудавалі мураваны касьцёл і калегіюм. Базыліка была завершаная да 1731 г. Тут дзейнічалі сэмінарыя для бедных дзяцей, друкарня, тэатар. У 1843 г., комплекс быў перададзены праваслаўным, а касьцёл сьв.Язэпа перабудаваны й пераназваны ў Мікалаеўскі сабор. А ў 1956 г. узарваны дзеля «добраўпарадкаваньня і рэканструкцыі» цэнтру гораду.

Праблема ахоўнае зоны на плошчы Свабоды й захаваньня падмуркаў сабору паўстала ня сёньня. Пасьля рэгістрацыі ў 2002 г. праваслаўнага прыходу Сьвятое пакутніцы Параскевы грамада вернікаў прэтэндавала на гэтую частку гістарычнага цэнтру. Тут да разбудовы катэдральнага сабору месьцілася драўляная царква Параскевы Пятніцы. Вернікі зьвярталіся ва ўсе інстанцыі з просьбаю аддаць гістарычную тэрыторыю ім, для ўзнаўленьня Катэдры. Ці, прынамсі, не зьнішчаць падмуркаў, не чапаць намоленае месца. Пагатоў, археолягі выявілі тут і старажытныя клады.

Але яшчэ ў лістападзе 2005 г. проста ў падмурак сабору ўставілі калядную ялінку, зрабіўшы крыжавіну з бэтону, глыбінёю ў чатыры мэтры. Цяпер работнікі «Віцебскводаканалу» рыюць там катлаваны, пракладаюць камунікацыі. У катлаване будзе каналізацыйны калодзеж, працы абумоўленыя неабходнасьцю пабудовы дзюкера (напорнага водаадводу) празь Віцьбу. Іначай каналізацыя ня справіцца з нагрузкай, якую дасьць будучы Маладзёжны цэнтар.



Бульдозэр у намоленым месцы.



Старшыня гарвыканкаму П.Драздоў пагражаў будаўнікам штрафамі.

«У туалет усе хочуць хадзіць. А бяз гэтай трубы каналізацыя працаваць ня можа», — камэнтуе сытуацыю кіраўнік «Віцебскводаканалу» Міхаіл Грынберг.

Месца працаў наведаў і старшыня гарвыканкаму Пётр Драздоў. Ён загадаў «даць штраф, а калі адновяць працы — зноў аштрафаваць». Пасьля яго ад’езду працы аднавіліся. У наступныя дні П.Драздоў зноў прыяжджаў, але ўжо бяз гучных заяваў.

Пад вечар на пляцы зьбіраецца купка моладзі і вернікаў. На агароджу катлавану чапляюць чорныя жалобныя стужкі.

У вялікай яміне відаць рэшткі муроў, на якіх дзенідзе захавалася тынкоўка, фрагмэнты росьпісаў. Капаючы, прарэзалі кладку аднаго з будынкаў комплексу Мікалаеўскага сабору (падчас праходжаньня кляштарнага муру зламаўся бур). Рэшткі будынкаў, што вымаюцца экскаватарамі, вывозяцца ў невядомым кірунку.

**Сяргей Харэўскі**

## 11,5% беларускіх выданьняў на выставе СМІ

Аглёдзелі мы ўсе 115 адзінак пэрыядычных выданьняў на выставе СМІ. І вось што падлічылі.

Свабоднай прэсы не было. У 15—17% ад агульнай колькасьці выданьняў трапляліся беларускія словы. *Цалкам беларускамоўныя толькі 3,5—4%.* Гэта — «Настаўнік», «Унівэрсітэт» (БДУ), «Сельская праўда» (Жабінка), «Народная трыбуна» (Берасьцейшчына).

*З ужываньнем беларускай мовы 8—9%.* «Навіны Камянеччыны» — па-расейску толькі праграма ТБ, 5/6 беларускай мовы. «Ляхавіцкі веснік» — па-расейску праграма і рэкляма. Пружанскія «Раённыя будні» — тое сама. «Да новых перамог» (Клецк) — болей за палову расейскамоўная. «Асіповіцкі край» — 1/7 па-беларуску. «Зямля і людзі» (Магілёўшчына) — 16 бачын фармату А3 — 1 беларуская. «Веснік Магілёва» — па-беларуску толькі гімн Магілёва. «Магілёўскія ведамасці» — з 16 старонак А3 па-беларуску толькі зацемка пра Шклоў Леаніда Анціпенкі. «Кобрынскі веснік» — па-беларуску адзінае віншаваньне. А «Драгічынскі веснік», наадварот, успамінае родную мову толькі ў *спачуваньнях родным нябожчыкаў (!).*

Ну, і ўжо зусім брутальна дзейнічаюць «Беларускі час» (ФПБ), «Царкоўнае слова» (16А2), «Шахцёр» і «Пінскі веснік» — аніводнага слова па-беларуску, выкарыстоўваюць *толькі беларускую шыльду.*

Прыпамінаецца такі ж «беларускі» часопіс «Гаспадыня». Выходзіць, 3,5—4% — фальсыфікацыя.

Выходзіць, *11,5% цалкам ці часткова беларускамоўных і 96,5% цалкам ці часткова расейскамоўных выданьняў.* То бок апошніх недзе ў 8,4 разы больш за колькасьць газэт з ужываньнем беларускай мовы.

**Тацяна Таполя, Юрась Навіцкі, Менск**

P.S. АМАП для аховы выставы прывезьлі на мікрааўтобусе і грузавіку.

## АЛЕСЬ ВЯЛЕЙСКІ

ДАРОГА ЗЬ МЕНСКУ

Дзьве з паловай гадзіны аўтобусам —
Еду зь Менску я да Вялейкі.
Ад сталёва-бэтонных офісаў
Я вяртаюся ў рай свой маленькі.

Калачуся ў грамадзкім транспарце —
Спасьцігаю яго выгоды.
Млоснасоўганьне гэта ў транс вядзе...
У салоне пах чосныка з потам.

А абапал дарогі — вёсачкі.
А ў вёсачках люд руплівы:
На вакенцы крыжыкам дошчачкі,
І пайшлі ў сталічныя нівы.

Каб расквеціць жыцьцё нэонамі,
Каб разжыцца грашыма й важнасьцю,
Пруць сяляне ў цэнтар мільёнамі
Ад радзімы за межы бачнасьці.

Край стаптаны, зьняможаны, схаяны.
Занядбаныя могілкі й хаткі.
Пасьміхаюцца бюсты-сталіны,
На манкуртаў гледзячы статкі...

Ад сталёва-бэтонных офісаў
Я вяртаюся ў рай свой маленькі.
Дзьве з паловай гадзіны аўтобусам —
Гэта зь Менску і да Вялейкі.

## ЮРАСЬ ПЕТУХОЎ

***

Ты маўчыш, не хаваеш вачэй,
Я маўчу, не хаваю надзей.
Цішыня. Прыпыніўся нат гук.
Толькі дотык спалоханых рук.

Не стрымацца павінен хтось з нас,
Не прамовіць «Бывай» у адказ.
Толькі хто — не істотна даўно,
З той прычыны, што мы ўжо — адно.

**2007 год — год 125-годзьдзя Купалы й Коласа. Сёлета «Наша Ніва» штонумар друкуе вершы. Чакаем новых твораў.**




**На мосьце над Нямігай 14 траўня.**

## Вайна з талеркамі дайшла да Менску

Улады сталіцы ўзяліся за талеркі. Яны патрабуюць дэмантаваць спадарожнікавыя талеркі з фасадаў дамоў. Галоўны архітэктар гораду Аляксандар Андрончык тлумачыць справу эстэтыкай. «Тыя дамы, фасады якіх выходзяць на вуліцы, мусяць выглядаць адапаведна, без спадарожнікавых антэн і кандыцыянэраў, якія парушаюць вонкавае аблічча забудовы».

## У Дзьвіне зноў зьявіліся плямы нафты

У Латвіі на Дзьвіне ў раёне Краславы і Дзьвінску зноў паставілі абсарбавальныя боны, бо на паверхні зноў зьявілася плеўка нафты. 5 траўня ў Бешанковіцкім раёне адбыўся другі прарыў расійскага магістральнага нафтапрадуктаправоду «Ўнеча—Вэнтсьпілс». Нафтапрадукты трапілі ў мэліярацыйны канал, злучаны з ракой Сьвячанкай — прытокам Улы, якая, у сваю чаргу, упадае ў Дзьвіну.

## На чатыры шлюбы — тры разводы

У Беларусі ў першым квартале году зарэгістравана 12441 шлюб і 8968 разводаў. У студзені-сакавіку, у параўнаньні са студзенем-сакавіком 2006 г., колькасьць шлюбаў зьнізілася на 9,8%, а лік разводаў вырас на 15,2%.

## Выйшаў на пляцоўку і жывым згарэў

У адным з дамоў сталіцы маладзён жывым згарэў на лесьвічнай пляцоўцы, куды выйшаў пакурыць перад ад'ездам на працу. Суседка пачула дым і выскачыла з кватэры пабачыць, адкуль ён ідзе. Яна першая стала гасіць полымя на вопратцы суседа, аднак па дарозе ў больніцу хлопец сканаў. Да таго часу як пагасілі полымя, на хлопцы згарэла ўся вопратка. Экспэрты пакуль ня могуць патлумачыць прычыну раптоўнага ўзгараньня. Існуюць дзьве гіпотэзы, якія тлумачаць такія выпадкі, калі няма рэальных доказаў падпалу ці іншых натуральных прычынаў узгараньня. Абедзьве маюць на ўвазе зьнешнюю крыніцу агню: гэта ўзгараньне ад статычнай электрычнасьці ці шаравой маланкі.

## Школьнікам забароняць карыстацца мабільнікамі

З новага навучальнага году ў школах Украіны загадам міністра адукацыі будзе забаронена карыстацца мабільнымі тэлефонамі ў часе заняткаў. Аднак ня будзе забаронена карыстацца мабільнікамі на перапынках.

## Каб заплаціць, дастаткова памахаць карткай

Ужо ў хуткім часе ў Брытаніі будзе ўведзены новы спосаб аплаты дробных пакупак. Дастаткова будзе наблізіць картку да спэцыяльнага прыстасаваньня, каб заплаціць за газэту, бутэрброд ці філіжанку кавы. Вынаходка ўжо мае назву «tap and go». Такімі карткамі можна будзе плаціць за пакупкі, кошт якіх не перавышае 10 фунтаў стэрлінгаў. Пры гэтым набіраць пін-коду ня трэба.

## Генэрал з Паўночнай Карэі — аўтар найлепшага анэкдота пра Буша

Падчас перамоваў прадстаўнікоў узброеных сілаў абедзьвюх Карэяў генэрал з КНДР Кім Чжон Чол рызыкнуў пажартаваць з Джорджа Буша. Вось гэты анэкдот:

Буш, паглыблены ў міжнародныя справы, падчас ранішняй прабежкі не заўважыў машыну.

Група вучняў у апошні момант сьцягнула прэзыдэнта Буша з праезнай часткі, ратуючы яму жыцьцё. Удзячны Буш пытаецца ў іх, якую б яны хацелі ўзнагароду.

— Хочам, каб нам зарэзэрвавалі месцы на нацыянальных могілках у Арлінгтане, — кажуць дзеці.

— Чаму? — пытаецца зьдзіўлены Буш.

— Бо бацькі нас дакладна пазабіваюць, калі даведаюцца, што мы зрабілі, — адказваюць вучні.

Анэкдот гэтак спадабаўся інтэрнаўтам у ЗША, што яны прызналі яго найлепшым за тыдзень.

## Да сустрэчы ў Канадзе

У нядзелю ў Маскве скончыўся 71-ы чэмпіянат сьвету па хакеі. Гаспадарам турніру, якія хацелі дома перарваць сэрыю няўдачаў, ізноў давялося задавальняцца бронзай. Расейцы ў паўфінале аказаліся слабейшымі за фінаў. У другім паўфінале леташнія чэмпіёны, швэды, не змаглі аказаць годнага супраціву канадцам.

У фінале канадцы ад пачатку захапілі ініцыятыву і перамаглі. Такім чынам, канадцы сталі дваццацічатырохразовымі чэмпіёнамі сьвету па хакеі. Дагэтуль чэмпіёнскіх тытулаў было аднолькава ў Канады і Расеі (з улікам СССР) — па 23.

У наступным годзе чэмпіянат пройдзе акурат у Канадзе — у Квэбэку і Галіфаксе. Як ні дзіўна, але радзіма хакею сусьветнае першынства будзе прымаць упершыню. Група беларусаў будзе літасьцівай: Швэцыя, Швайцарыя, Беларусь, Францыя.

**Зьміцер Панкавец, Вольга Данішэвіч, з выкарыстаньнем інфармацыі «Комсомольской правды в Белоруссии», LETA, БЕЛТА, Telegraf.by, generation.by, «Рэчпаспалітай»**

## Магіла Ірада

Ізраільскія археолягі, на чале з праф. Егудам Нецэрам з Габрэйскага ўнівэрсытэту ў Ерусаліме, адкрылі мэмарыяльную грабніцу, у якой быў пахаваны цар Юдэі Ірад. Пахавальны комплекс разьмяшчаўся за 12 км ад Ерусаліму ў старажытным Іродыюме.

Археолягі выявілі рэшткі ўнікальнага саркафагу, але шкілету самога нябожчыка ў ім не было. Дасьледчыкі мяркуюць, што зьнішчэньне шкілету цара адбылося яшчэ ў старажытнасьці.

Ірад I, званы Вялікім, панаваў у Юдэі ад 40 г. да н.э., прызначаны Рымам. Паводле Эвангельля, даведаўшыся ад вешчуноў аб нараджэньні будучага цара Юдэйскага, Ірад загадаў перабіць усіх хлопчыкаў у Бэтлееме ад двух гадоў і меншых.

З гістарычных крыніцаў, у першую чаргу ад Ёсіфа Флавія, вядома, што Ірад быў спраўным, але вельмі дэспатычным уладаром. Ён застаўся ў гісторыі як асоба, якая збудавала марскі порт у Цэзарэі і перабудавала Другую Сьвятыню ў Ерусаліме. А таксама як асоба, якая маніякальна баялася замахаў на сваё ўласнае жыцьцё. З гэтай прычыны загадаў забіць сваю жонку Марыям і трох сыноў. Пры гэтым у адносінах да Рыму быў бязьмежна падатлівым і абсалютна верным.

**Генадзь Семянчук**

# Крамбамбуля сьвяточная

Крамбамбуля, Go–records, 2007




У апалітычным раней праекце Вольскага зьявіліся пратэставыя ноткі.

Музычная энцыклапэдыя сьвятаў ад самага вясёлага беларускага поп-рок праекту. У альбоме апяваюцца, як традыцыйныя сьвяты (Купальле, Каляды), так і саўковыя разам з малазвыклымі яшчэ эўрапейскімі (як Хэлоўін ці дзень сьв.Патрыка). Музыка разьлічаная ня толькі на тое, каб павесяліцца ды патанчыць. У апалітычным раней праекце Вольскага зьявіліся пратэставыя ноткі, як у песьні пра «таварыш маўзэр», прысьвечанай Дню Вялікай Сацыялістычнай Рэвалюцыі. «Дасталі вы сваімі Сталіным ды Дзяржынскім», — пяецца тут. Калі ўлічыць разнаплянавасьць апошніх альбомаў NRM ды ZET, можна сказаць, што мяжа між гэтымі праектамі ды «Крамбамбуляй» стала зусім празрыстай. Цяпер яе язык не павернецца назваць «папсовым» ці то «эстрадным» праектам, ён канчаткова скаціўся ў андэграўнд. Да ўсяго, апошнія песьні «Крамбамбуля» запісала бяз знаных гасьцей — Гюнэш, Кулінковіча і Міхалка, таму харызма Лявона тут запанавала напоўніцу. На «Сьвяточнай» няма гіту калібру «Абсэнту» і «Гасьцей», які б адразу падхапіў народ. Кожная песьня — добрая па-свойму, але ніводная не выбіваецца з шэрагу ды ня вязьне на вушах. Затое каманда ўзбагацілася ў музычным пляне — на дыску сустракаем стылізацыі пад рэгі, цыганскую музыку, стыль ВІА, фольк-рок. Альбом каштоўны і мультымэдыйнай часткай, аформленай з гумарам ды густам. «Крамбамбулю» можна лічыць пачынальнікамі беларускага карпаратыўнага поп-року. На нефармальных урачыстасьцях, вясельлях, днях народзінаў бяз гэтай музыкі аніяк.

# Присоединяйся к нам

SOK, Aist music, 2006




«Хочаш жыць — спыніся, не ўдыхай!»

Дэбютны альбом адной з самых таленавітых альтэрнатыўных камандаў сталіцы. Тым, хто не наведвае клюбныя канцэрты, гэты гурт мог запомніцца жорсткай ды эмацыйнай рэччу «Менск — горад свабоды» зь «Песень свабоды-2». SOK не намагаецца вылучыцца сярод дзясятку камандаў, што працуюць у гэтай плыні. Хлопцы з дапамогай гард-коравых стандартаў выказваюць сваё стаўленьне да жыцьця, ад якога пры жаданьні можна ўзяць усё. Але гэта не тупое апяваньне алькагалічных прыгодаў ці тое наркатычнага трансу: «Хочаш жыць — спыніся, не ўдыхай!» — заклікаюць хлопцы ў песьні «Какаін». Напоўніцу выхад сваім эмоцыям SOK дае ў ангельскамоўным блёку («Aim» і «SOK»). Але, калі прыслухацца, пад брутальнай абалонкай можна разгледзець завуаляваную рамантыку. «Вуліца надзяляе цябе свабодай, хочаш быць такім — заставайся з намі//Там, дзе мы стаім пад промнямі сьвятла, гарадзкое неба матляе сваім сьцягам», — пяецца ў загалоўнай песьні, а перадапошняя кампазыцыя «D&V», не зважаючы на жывёльныя рыкі ў рэфрэне, наагул зараджае station... 

Нельга не заўважыць, што група досыць прыстойна гучыць і проста створана дзеля выступаў на рознастайных open-air. Для тых, хто не пайшоў у гардэроб у час выступу апошніх «рок-каралёў».

# Потому что люблю

Аляксей Хлястоў, West Records, 2006




Яму наканавана граць ролю «старога хлопчыка».

Другі дыск эстрадніка, на песьнях якога грунтуецца славуты «фармат» беларускага радыё і тэлебачаньня. Нетаропкі Хлястоў выступаў яшчэ на «Славянскім базары-93», трапіў у студыю «Сяброў», а пасьля пакінуў шэрагі «дзяржаўных» папсавікоў і зьехаў на доўгі час у Бахрэйн. Зарабіўшы грошай, ён наноў збудаваў кар'еру незалежнага выканаўцы з арыентацыяй на ўзорную эўрапейскую поп-музыку. У чым значна апярэдзіў свайго брата — Андрэя Хлястова. Аранжыроўкі ў яго куды больш густоўныя, чым у пloймы калегаў па «Срэбраным грамафоне». Музыка Хлястова надта ўжо рафінаваная, нашпігаваная таннымі клявішнымі найгрышамі. Сьмелым музычным рашэньням тут ня месца. Вынятак — хіба апошняя песьня «Яна» з прыгожа уплеценым саксафонам і алюзіямі на Джорджа Майкла пачатку 90-х. Хлястоў імкнецца да надзвычайнай спрошчанасьці і ў тэкстах. Ён ведае, чаго ад яго хочуць саманазваныя беларускія прадусары і выдатна адчувае стэрэатыпы сваёй немудрагелістай аўдыторыі ад 13 да 18 гадоў. Падаецца, што яму наканавана граць ролю «старога хлопчыка», да скону пеючы ўзвышаныя саладжавыя банальнасьці пра неба ды зоры (глядзім на назвы песень: «Уварвацца ў неба», «Дзьве зоркі», «Аскепкі неба»…). Для тых, каму мала FM-прыймача.

**Сяргей Будкін**




Анталёгія «Жанчыны выходзяць з-пад кантролю: беларускае жаночае апавяданьне».

Творы найлепшых сучасных аўтарак. Прадмова Іны Кулей.




Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by

Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.




Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі




Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў




Бабілёнская бібліятэка.

Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы»




Сямён Печанко. У Беларускім войску. (Падарунак прызыўніку)




Найясьнейшая Рэч Паспалітая.

Цывілізацыя–Культура–Рэлігія–Палітыка–Авантура–Героіка–Успамін




# Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць самай адчайнай пісьменьніцы нашаніўскай жаночай лігі.




Застаемся!

Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае

пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў

# Ноч музэяў

**19 траўня (сб) у Нацыянальным мастацкім музэі** (вул. Леніна, 20), у рамках міжнароднай ініцыятывы «Ноч музэяў», пройдзе імпрэза «Пад маскай ночы». Музэй зьменіць звыклы рэжым працы і будзе працаваць **ня толькі ўдзень, але й уначы**. **З 20.00 да 00.00** яго наведнікі стануць удзельнікамі сапраўднага карнавалу. Бясплатны квіток атрымае той, хто прыйдзе ў самаробнай масцы. А ў фінале сьвята аўтар найлепшай маскі атрымае падарунак. Сьвята адбудзецца адначасова на дзьвюх пляцоўках: у фае (джаз, выстава ў жанры ню) і ў новым корпусе (ды-джэй, выступ школы баявых мастацтваў).



## ВЫСТАВА

### Рышард Май і яго вучні

**У Нацыянальным мастацкім музэі** працуе выстава «Рышард Май і ягоныя вучні», дзе можна будзе ўбачыць творы мастака і ягоных вучняў за 2004-2007 гады.

## КАНЦЭРТЫ

### Дзень нараджэньня Кулінковіча

**17 траўня (чц) у клюбе «Night Star»** (вул.Сьвярдлова, 2) — вялікі сольны канцэрт гурту Neuro Dubel, у гонар дня нараджэньня Аляксандра Кулінковіча. **Пачатак у 19:30.**

Кошт квіткоў: 20 000 (танцпляц), 30 000 (столікі). Даведкі па т.: 671-58-65.

### Руся ў «Графіці»

**18 траўня (пт)** гурт «Indiga» запрашае на вечар ROCKавай музыкі ў **клюб Графіці** (зав.Калініна, 16). **Пачатак а 19.30.** Замова месцаў: 779-99-18, 179-99-18, ICQ: 165-650-843.

### Нагуаль

**24 траўня (чц) у «Графіці»** грае «Нагуаль». Спэцыяльны госьць: Масуд Талібані (Іран, Курдыстан). Пачатак у 19.30.

## АКЦЫЯ

### Музыкі супраць разбурэньня Горадні

За захаваньне гістарычнага цэнтру Горадні пройдзе шэраг канцэртаў беларускіх выканаўцаў. Першым 22 траўня выступіць бард Віктар Шалкевіч. Пачатак канцэрту а 18-й гадзіне. Дзе будзе канцэрт — арганізатары паведамяць пазьней на сайце www.za-svabodu.org.

## РЫЦАРСКІ ФЭСТ

### Меч Лідзкага замку

**19—20 траўня ў Лідзкім замку пройдзе рыцарскі фэст.** У праграме: турнір з прызавым фондам **500 у.а.**; «асада замку» — пастановачная бітва з элемэнтамі рэальнага бою; вечаровая забаўляльная праграма ў рыцарскім лягеры ў замкавым двары.

Кошт квіткоў: 10 тыс. руб.

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**20 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».
**18 (пт)** — «Я не пакіну цябе...».
**19 (сб)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**21 (пн)** — «Смак яблыка».
**23 (ср), 24 (чц)** — «Чорная панна Нясьвіжу».
**25 (пт)** — «Ідылія».
**26 (сб)** — «Вольга».
**27 (ндз)** — «Вечар».
*ранішнія спэктаклі*
**20 (ндз)** — «Паўлінка».
*малая сцэна*
**18 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**21 (пн)** — «Баляда пра каханьне».
**24 (чц)** — «Варшаўская мэлёдыя».
**26 (сб)** — «Апэльсінавае віно».
**27 (ндз)** — «Маці».

### Тэатар беларускай драматургіі

**18 (пт)** — «Адвечная песьня».
**19 (сб)** — «Вячэра».
**21 (пн)** — «Містэр Розыгрыш»
**22 (аўт)** — «Валянціна»
**23 (ср)** — «Ганна ў тропіках».
**24 (чц)** — «Іванаў».
**25 (пт)** — «Нязваны госьць»
**26 (сб)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі».

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Шрэк, Бэтховэн і баявік «Выбары»

Менскія кінапрэм'еры тыдня.

**Шрэк Трэці** (Shrek the Third)
ЗША, 2007, каляровы, 90 хв.
Рэжысэры: Крыс Мілер, Раман Хай
Жанр: Анімацыйныя камэдыйна-казачныя прыгоды.

Шрэк мусіць насьледаваць каралеўства. Але зялёнаму волату гэта не падабаецца, бо давядзецца разьвітацца з родным балотам. Разам з Восьлікам і Катом ён адпраўляецца на пошукі сапраўднага караля... Артура. А ў каралеўстве Фіёны малімонны сын фэі зьдзяйсьняе фашыстоўскі пераварот. У краіне разгортваецца партызанская барацьба...

Прэм'ера заплянаваная на 17 траўня. Фільм будзе дэманстравацца ў кінатэатрах «Аўрора», «Масква», «Кастрычнік».

**Перапісваючы Бэтховэна** (Copying Beethoven)
ЗША — Нямеччына, 2006, 104 хв.
Рэжысэр: Агнешка Голянд
Ролі выконваюць: Эд Гарыс, Дыяна Кругер, Ральф Райч, Біл Ст'юарт
Жанр: Біяграфічная драма, мэлядрама

Студэнтка Венскай кансэрваторыі Ганна становіцца асыстэнткай Бэтховэна, калі ён працуе над Дзявятай сымфоніяй. Дзяўчына сама мае амбіцыі кампазытара, а Бэтховэн разглядае яе як крыніцу натхненьня... Агнешка Голянд — скандальная рэжысэрка («Поўнае зацямненьне»).

Сэансы ў кінатэатрах «Аўрора», «Перамога», «Цэнтральны», «Мір» ад 17 да 20 траўня.

Таксама ў кінафармаце жахаўка Такашы Шыміцу «Рэінкарнацыя», ганконгскі баявік «Выбары», прадстаўлены на канскім фэсьце і кітайская сацыяльная драма «Натурморт», адзначаная «Залатым ільвом» Вэнэцыянскага фэсту.

**Андрэй Расінскі**

**Просты хлопец Бульбашэўскі вырашае стаць першым беларускім супэрмэнам — Бульбманам, але аказваецца ўцягнутым у канфлікт між старшынямі двух калгасаў...**




МАЛЯВАЎ ЛЯВОН ВОЛЬСКІ

## 31 кг мяса пад сукенкай

спрабавала вынесьці 57-гадовая гардэробшчыца Гарадзенскага мясакамбінату. Міліцыя злавіла яе на прахадной. Цяпер аматарку дармавых катлетаў чакае суд.

## Адно акно

У вёсцы Сідаравічы, што ля Занарачы, краму РУП «Нарачанскі курортгандаль» сёлета ўжо другі раз абкрадаюць. Першы раз — на Вялікдзень, і яшчэ вось 8 траўня. І ўсё праз адно і тое ж акно. І злодзей вядомы, тутэйшы. Колькі год таму ўжо адбыў пэўны тэрмін пакараньня. І зноў за сваё! Шмат у краме не бярэ. Каб не пацягнула на крымінальную справу.

Што злодзей лезе ў краму, як быццам бы ніхто ня бачыў і ня чуў. А потым выяўляецца, што бачылі і пыталі ў яго: «Што ты робіш?» — «Што, што? Ня бачыш? У магазін лезу». — «А мне дай!» — «Ну, на табе бутэльку віна».

Вось так і жыве забаўляючыся наша беларуская вёска.

**Narach.org**

**Калі б улады хацелі яшчэ больш прапіярыць дасягненьне Калдуна на Эўрабачаньні.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

— Вашай увазе прапануецца новы афіцыйна зацьверджаны ўзор п'едэсталу...

**Эўрагледзішча і Эўравідовішча. Піша Тэда Лі. Старонка 22.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Віцебскай губэрні, Вушацкай вол.** начальства трэбавала выбраць дзясяцкіх на помач паліцыі. Валасны сход адказаўся даць.Тагды валасны пісар напісаў нейкі прыгавор і стаў заклікаць мужыкоў па адным, каб тыя яго падпісвалі. Баязьлівыя паслухалі. Дайшла чарада да Цярэнція зь вёскі Козіна. Ён папрасіў пісара прачытаць паперу, інача падпісваць не хацеў: «Трэба,— кажа, — ведаць, пад чым даеце мне падпісвацца». Пісар пачаў яго палохаць і лаяць «ісьцінна рускімі» славамі. Цярэнцій падумаў–падумаў, і, пачасаўшы патыліцу, кажа: «А якое ж ты мне начальства? Ты — наш пастух! Мы цябе кормім, даем вопратку, і ты павінен пісаць тое, што мы табе прыкажам!» Іван зь вёскі Расно падтрымаў Цярэнція. Пісар данёс земскаму, што мужыкі бунтуюць. Земскі распарадзіўся, каб іх двох арыштавалі. Мужыкі надта раззлаваліся на «начальства».

**(Віт. Гол.)**
**Наша Ніва, №18, 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СУД

**30 траўня, 14.15, суд Савецкага** раёну (Лагойскі тракт, 3). Прыходзь на суд па справе маладафронтаўцаў — падтрымай беларускую моладзь! Якава 4:7! Брат

### КНІГІ

**Прапаную камплект** факсымільных выданьняў «Нашай Нівы.» Т.1, 2, 3 ,4. Дорага. Рэпрынт «Исторические сведения… о Белоруси» 1855. «История белорусско–литовского полесья» 1882, інш. Т.: 753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Прапаную кнігі**: «Энцыкляпэдыя ВКЛ» у 2 тамах, «Тэўтонскі ордэн», Ластоўскі «Кароткая гісторыя Беларусі», «Беларускі кнігазбор»: Гётэ, Летапісы і хронікі, Каліноўскі, Баршчэўскі, Філаматы і Філарэты, Улашчык, Дамейка, Ельскі, Пяткевіч ды інш. кнігі, багаты выбар. Т.: 753–70–05

**Кнігі** на беларускай, ангельскай мовах. Для падарунка іншаземцам, тым, хто вывучае бел., анг. мовы. Т.: 753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Набор**, рэдагаваньне, інтэрвію, аналітыка, падбор, апрацоўка матэрыяла, падрыхтоўка рукапісу да друку, пераклад, выдавецкія праекты, распаўсюд. Т.: 753–91–96. alesknigi@mail.ru

**Беларускія кнігі** з сэрыі «Кнігарня «Нашай Нівы», «Беларускі кнігазбор» ды іншыя на кніжным кірмашы па вул. Я. Купалы,27, павільён В. Т. для даведак: 771–49–39

### ПРАЦА

**Дзяўчына-філялягіня** шукае любую працу, зьвязаную з тэкстамі. Вялікі вопыт працы. Т.: 174–98–91

**Філёляг** шукае працу. Т.: 294–13–38. Сьвятлана

### СЯБРОЎСКАЕ ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа па маршрутах: 20.05 «Пуцявінамі Драздовіча»: Гарадзец–Лужкі–Германавічы–Мёры–Двор Дзедзіна–Ідолта–Лявонпаль. 25.05–28.05: Торунь–Хелмна–Добжынь. Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509–12–16, 110–19–28

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Сяргею К. зь Менску.** У «Бзычцы» ўсё праўда. Але, каб яна стала літаратурай, трэба папрацаваць са стылем і сюжэтам.

**Зьмітру Х.** «Тарашкевіца» — гэта правапіс. «Гаварыць на тарашкевіцы» ці «пачуць на тарашкевіцы» немагчыма. Ёсьць нормы і варыянты вымаўленьня, а ёсьць варыянты і нормы напісаньня.


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф–рэдактар Андрэй Дынько
фотарэдактар Арцём Лява
галоўны рэдактар Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
заснавальнік Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2839. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 16.05.2007.
Замова № 2646.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.